Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 ЧЭРВЕНЯ 2012 г. ПЯТНІЦА № 103 (27218) Кошт 1200 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# УЛАДЗІМІР ПУЦІН ПРЫБЫЎ З АФІЦЫЙНЫМ ВІЗІТАМ У БЕЛАРУСЬ

**Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін прыбыў з афіцыйным візітам у Беларусь, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

**Каля трапа кіраўніка расійскай дзяржавы сустракаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Лідары краін абмяняліся цёплымі прывітаннямі. Афіцыйная цырымонія сустрэчы ўключала прадстаўленне членаў дэлегацый, выкананне дзяржаўных гімнаў двух краін.**

**Прэзідэнты Беларусі і Расіі накіраваліся ў адным аўтамабілі на афіцыйныя перагаворы, выкарыстоўваючы час пераезду для нефармальнай размовы.**

## Добрыя перспектывы супрацоўніцтва

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адзначыў добрыя перспектывы для далейшага развіцця супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Расіяй, сустракаючыся з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным у рэзідэнцыі «Заслаўе».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што цяперашняя сустрэча праходзіць напярэдадні 20-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж дзвюма краінамі. «Хачу падзякаваць вам і расійскаму кіраўніцтву за ўсё тое, што мы зрабілі, асабліва ў апошнія гады. У нас ёсць вынікі і ў палітыцы, і ў эканоміцы», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Паводле яго слоў, галоўны вынік супрацоўніцтва ў сферы палітыкі — стварэнне Саюзнай дзяржавы, дзе па ўсіх напрамках бакі дасягнулі значнага прагрэсу. «У нас няма граніцы паміж дзвюма краінамі, у нас людзі спакойна перамяшчаюцца, маюць роўныя правы, і расіяне ў Беларусі, і беларусы ў Расіі, мы маем адзіную абаронную прастору, агульныя войскі процідаветранай абароны, саюзную групоўку на заходнім напрамку і многае іншае. Па ўсіх напрамках мы дасягнулі пэўных вынікаў», — канстатаваў беларускі лідар. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў гэтым напрамку неабходна дзейнічаць і далей, умацоўваючы і развіваючы праект Саюзнай дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі таксама адзначыў вялікія поспехі ў эканамічнай інтэграцыі. «Мы стварылі Мытны саюз і Адзіную эканамічную прастору. Гэта значыць мы свой вопыт (інтэграцыі на двухбаковай аснове — *Заўвага БЕЛТА*) перанеслі на больш шырокае кола дзяржаў. Да нас сёння прыглядаюцца», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. У гэтым плане Аляксандр Лукашэнка адзначыў Украіну, якая праяўляе цікавасць да супрацоўніцтва з АЭП: «Пакуль яшчэ нейкія выключэнні і абмежаванні, але ўсё роўна, значыць, ёсць прыцяжэнне да гэтага курсу».

«Мы нямала зрабілі за гэтыя два дзясяткі гадоў, і, лічу, нас чакаюць нядрэнныя гады. Упэўнены (упэўненасць мне надаюць вашы перадвыбарныя і пасляывыбарныя заявы), што вектар еўразійскай прасторы Расійская Федэрацыя будзе развіваць і ўмацоўваць. Мы да гэтага гатовы», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.




Фота БЕЛТА.

## «Беларусь — асаблівы партнёр Расіі»

Аб гэтым учора, сустракаючыся з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам, заявіў Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін.

«Гэта мая першая паездка за межы Расіі пасля ўступлення на пасаду Прэзідэнта. Гэта зразумела. Беларусь не проста наш блізкі, яна асаблівы партнёр», — адзначыў кіраўнік расійскай дзяржавы.

Уладзімір Пуцін адзначыў поспех дзвюх краін у развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. У прыватнасці, ён канстатаваў, што па выніках 2011 года рост узаемнага тавараабароту склаў каля 40 працэнтаў, дасягнуўшы амаль $40 млрд. Дадатная дынаміка захоўваецца і ў гэтым годзе. «Гэта відавочнае сведчанне правільнага выбару ў напрамку інтэграцыі», — падкрэсліў Прэзідэнт Расіі.

Уладзімір Пуцін выказаў словы падзякі Аляксандру Лукашэнку за яго актыўную падтрымку інтэграцыйных працэсаў на постсавецкай прасторы. Прэзідэнт Расіі выказаў гатоўнасць абмеркаваць увесь комплекс актуальных пытанняў, якія стаяць на парадку дня дзвюх дзяржаў.

Візіт Прэзідэнта Расіі ў Беларусь працягваецца.

■ Парламенцкі дзённік

# ПРАВА НА ЖЫЛЛЁ

**Учора Нацыянальнаму Сходу Рэспублікі Беларусь быў прадстаўлены праект новай канцэпцыі дзяржаўнай жыллёвай палітыкі Беларусі**

**Змены ў дзяржаўнай жыллёвай палітыцы выкліканы неабходнасцю зменшыць ільготнае крэдытаванне і разам з тым забяспечыць правам на камфортнае жыллё ўсіх грамадзян Беларусі. Гэта вынікала з даклада намесніка прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Анатоля КАЛІНІНА на сумесным пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі.**

## Каму дзяржава дапаможа

У праекце канцэпцыі ўрадам прапануецца прымаць на ўлік толькі льготныя катэгорыі грамадзян, якія маюць права на дзяржаўную падтрымку пры будаўніцтве, рэканструкцыі альбо набыцці жылля згодна з сёлетнім указам кіраўніка дзяржавы №13. Вызначана 15 катэгорый такіх грамадзян. Пры гэтым за тымі, хто раней быў прыняты на ўлік, захаваецца права заставацца ў чарзе да моманту будаўніцтва.

Толькі тыя, хто не маюць на тэрыторыі Беларусі ва ўласнасці або карыстанні жылля, у якім забяспечанасць агульнай плошчай складае не менш за 15 кв. м., а ў Мінску — не менш за 10 кв. м, будуць мець падставы ўстаць на «жыллёвы» ўлік. Не будуць прымацца на ўлік грамадзяне, якія раней выкарыстоўвалі права дзяржаўнай падтрымкі, за выключэннем шматдзетных сем'яў.

Для таго, каб рух у жыллёвай чарзе быў празрыстым, плануецца стварыць да 2014 года адзіны электронны дзяржаўны рэестр.

Долю ўласных сродкаў грамадзян у будаўніцтве жылля плануецца павялічыць з 35% да 50% на працягу наступных 3 гадоў. Аб'ёмы льготнага крэдытавання будуць зніжаны да 2015 года да 28%.

— Гэтыя падыходы плануецца рэалізаваць паэтапна , шляхам павышэння дабрабыту насельніцтва і стварэння ўмоў для развіцця агульнапрынятых у сусветнай практыцы пазабюджэтных крыніц фінансавання будаўніцтва жылля: іпатэкі, жыллёва-будаўнічых аблігацый і сістэмы жыллёва-будаўнічых зберажэнняў, — патлумачыў Анатоль КАЛІНІН.

Намеснік прэм'ер-міністра заўважыў, што сёння дзейнічае сістэма будаўнічых зберажэнняў, але насельніцтва ёй пакуль не карыстаецца з-за высокай крэдытнай стаўкі. Па гэтай жа прычыне не працуе і Закон аб іпатэцы.

## Сацыяльнае жыллё і арэнда

Найбольш неабароненым катэгорыям грамадзян праект Канцэпцыі прадугледжвае прадастаўляць памяшканні сацыяльнага карыстання. Сёння такое жыллё маюць права атрымліваць 19 катэгорый, з іх 12 — без уліку даходаў і маёмаснага стану. На пачатак года колькасць такіх грамадзян у чарзе складала 19,3 тысячы, большасць з якіх — сіроты (11 тысяч).

Для тых, хто не мае магчымасці будаваць уласнае жыллё, прадугледжваецца арэнда. Сёлета ў Беларусі ўжо створаны фонд арэнднага жылля з больш чым 200 кватэр і дамоў, з іх у Мінску — 57. Да канца года плануецца пабудаваць 46 тысяч кв.м арэнднага жылля, а да 2015 года — у 5 разоў больш, або 250 тысяч кв.м.

Для таго, каб у якасці арэнднага жылля не выдзяляліся кватэры нізкай якасці, урад бярэцца распрацаваць пералік умоў, якім павінны адпавядаць такія кватэры, а таксама захады па абароне правоў грамадзян на пражыванне ў іх.

У фонд арэнднага жылля плануецца паступова перадаваць свабодныя службовыя кватэры і інтэрнаты (у першую чаргу — камунальнай формы ўласнасці), акрамя інтэрнатаў вучэбных і спецыялізаваных спартыўных устаноў.

СТАР. 2

### УДЗЕЛЬНІКАМ РЭСПУБЛІКАНСКАГА ФЕСТЫВАЛЮ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР

***Дарагія сябры!***

*Сардэчна віншую вас з цудоўным святам — IX Рэспубліканскім фестывалем нацыянальных культур.*

*За тысячагадовую гісторыю беларуская зямля, нібы ласкавая матуля, сабрала пад свае крылы прадстаўнікоў розных нацый, якія сёння адчуваюць сябе адной вялікай сям'ёй. Іх еднасць і братэрства — сакрэт той сілы, дзякуючы якой наша Радзіма паспяхова пераадолела ўсе гістарычныя выпрабаванні і стала незалежнай дзяржавай. Грамадзянскі мір і згода, непрымальнасць любых форм дыскрымінацыі і варожасці на этнічнай глебе з'яўляюцца найвялікшымі духоўнымі каштоўнасцямі краіны. Важкі ўклад у захаванне культурнай самабытнасці народаў, што жывуць на Беларусі, уносіць Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур. Ён заўжды збірае суквецце талентаў і дорыць добры настрой.*

*Спадзяюся, што сёлетні фестываль прадоўжыць гэтыя традыцыі, паслужыць умацаванню адзінства жыхароў нашай краіны, дапаможа ім зберагчы сваю духоўную адметнасць дзеля ўзбагачэння агульнай беларускай культуры. Жадаю вам здароўя, шчасця і поспехаў у працы на карысць любімай Айчыны.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

### *ЛІЧБА ДНЯ*

**Прафіцыт бюджэту сектара дзяржаўнага кіравання Беларусі за студзень-красавік 2012 года склаў Br5,9 трлн, або 4 працэнты ВУП, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Міністэрстве фінансаў. Бюджэт сектара дзяржаўнага кіравання Беларусі ўключае рэспубліканскі бюджэт, мясцовыя бюджэты і бюджэт Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.**

### НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 15° |
| Віцебск | + 17° |
| Гомель | + 20° |
| Гродна | + 13° |
| Магілёў | + 19° |
| Мінск | + 17° |

### Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.06.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8410,00 | ▲ |
| Еўра | 10430,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 255,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1040,78 | ▲ |




■ З першых вуснаў

# У ВАС ЁСЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ ПАВЯЛІЧЫЦЬ СВАЮ ПЕНСІЮ...

**Учора міністр працы і сацыяльнай абароны Беларусі Марыяна Акіндзінаўна ШЧОТКІНА пры падтрымцы БЕЛТА правяла прамую тэлефонную лінію і online-прыём, у ходзе якіх адказала на пытанні ўсіх, хто датэлефанаваўся або звярнуўся з пісьмовымі пытаннямі online.**



Фота БЕЛТА.

## ПРАЦОЎНЫЯ ПЕНСІІ БУДУЦЬ ПАВЫШАНЫ

**Пятроўская Н.І., Светлагорск:** *Ці будуць яшчэ да канца гэтага года павышацца працоўныя пенсіі?*

**М. А. Шчоткіна:** Так, будуць. Згодна з Указам Прэзідэнта Беларусі ад 16 студзеня 2012 г. № 35 «Аб павышэнні пенсій» у 2012 годзе працоўныя пенсіі будуць яшчэ пераразлічаны з 1 жніўня і з 1 лістапада, зыходзячы з сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы за II і III кварталы 2012 г. адпаведна.

**Марыя Іванаўна, г. Слуцк:** *Я пенсію атрымліваю з 2010 года, працую. Ці магу я адмовіцца ад пенсіі — з тым, каб у будучыні яе павялічыць? Чула, што па гэтым пытанні Прэзідэнт падпісаў Указ. Ці гэта закране толькі «новых» пенсіянераў?*

**М. А. Шчоткіна:** Так, Марыя Іванаўна, такая магчымасць у вас ёсць. Цяпер у адпаведнасці з арт. 23-1 Закона «Аб пенсійным забеспячэнні» пры звароце па пенсію па ўзросце пазней дасягнення агульнавызначанага пенсійнага ўзросту (або пры адмове ад атрымання ўжо прызначанай пенсіі па ўзросце) пенсія павялічваецца на 1% заробку за кожныя два месяцы працы без атрымання пенсіі. Пры гэтым пенсія максімальным памерам (75% заробку) не абмяжоўваецца.

Указам Прэзідэнта ад 18 сакавіка 2012 г № 136 «Аб мерах па ўдасканаленні пенсійнага забеспячэння грамадзян», які ўступае ў сілу з 1 кастрычніка 2012 г., названыя працэнты павялічаны. Так, за першы поўны год неатрымання пенсіі яна будзе павялічана на 6% заробку, які прымаўся для яе вылічэння, за другі — на 8%, за трэці — на 10%, за чацвёрты — на 12%, за пяты і кожны наступны год — на 14%. Калі праца без атрымання пенсіі менш поўнага года, то павелічэнне за кожныя поўныя два месяцы такой працы складзе 1% заробку. Паказаныя памеры павелічэння пенсіі сумуюцца паміж сабой.

## ПЕРАД НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДАМ ШМАТДЗЕТНЫМ СЕМ'ЯМ ВЫПЛАЦЯЦЬ МАТЭРЫЯЛЬНУЮ ДАПАМОГУ

**Святлана Ражкова, Мінск:** *Мяне вельмі хвалюе пытанне, ці будзе выплачана матэрыяльная дапамога беларускім сем'ям на падрыхтоўку дзяцей да школы? Якімі будуць памеры гэтай дапамогі?*

**М. А. Шчоткіна:** З 2012 года прадугледжана выплата аднаразовай матэрыяльнай дапамогі да навучальнага года сем'ям, што выхоўваюць траіх і больш дзяцей, якія навучаюцца ва ўстановах агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі. Аднаразовая дапамога ў памеры да 30% бюджэту пражытковага мінімуму, дзейнага на 1 жніўня, будзе выплачвацца на кожнае дзіця школьнага ўзросту. Выплата будзе ажыццяўляцца на падставе рашэнняў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў з улікам наяўных магчымасцяў.

**Святлана, Мінская вобласць:** *Я адна выхоўваю двухгадовага сына, цяпер не працую. Думаю звярнуцца па падтрымку да дзяржавы. Скажыце, калі ласка, на які перыяд мне можа быць прадастаўлена адрасная дапамога?*

**М. А. Шчоткіна:** Няпоўным сем'ям, у якіх маці (бацька) ажыццяўляе догляд (знаходзіцца ў водпуску па доглядзе) дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў, дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога ў выглядзе штомесячнай сацыяльнай дапамогі можа быць прадастаўлена на 6 месяцаў. Вам неабходна звярнуцца ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы рэгістрацыі.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### БРЫТАНСКІЯ МЕДЫКІ АБВЯСЦІЛІ ПЕРШУЮ ЗА 40 ГАДОЎ ЗАБАСТОЎКУ



Брытанская асацыяцыя медыцынскіх работнікаў абвясціла аб правядзенні аднадзённай усеагульнай забастоўкі 21 чэрвеня, паведамляе BBC News. У гэты дзень медыкі па ўсёй краіне не будуць весці прыём і праводзіць нетэрміновыя аперацыі. Гэта першая забастоўка медыкаў у Вялікабрытаніі з 1975 года. Медыкі выступаюць супраць рэформы пенсійнай сістэмы, якая прадугледжвае павышэнне пенсійнага ўзросту да 68 гадоў і павелічэнне адлічэнняў у пенсійны фонд. Нягледзячы на страйк 21 чэрвеня брытанскія медыкі выйдуць на працу, але будуць аказваць толькі неадкладную дапамогу.

### ВА УКРАІНЕ ДНІ МАТЧАЎ ЕЎРА-2012 ЗРАБІЛІ ВЫХАДНЫМІ

Ва Украіне вырашылі зрабіць выхаднымі дні, у якія будуць праводзіцца матчы Еўра-2012. Такое рашэнне, як паведамляе УНІАН, было прынята ўрадам рэспублікі. Распараджэнне ўрада тычыцца тых гарадоў, якія будуць прымаць матчы: Львова, Харкава, Данецка і Кіева. Пры гэтым дадатковыя выхадныя жыхарам гэтых гарадоў прыйдзецца адпрацоўваць па суботах.

### ТЛУСТЫЯ ПРАДУКТЫ ХАРЧАВАННЯ НАЗАПАШВАЮЦЬ АТРУТНЫЯ ЗЛУЧЭННІ

У мясе, рыбе і арахісавым масле можна знайсці сляды рэчыва, якое запавольвае гарэнне пластмас, перадае Discovery News. Гэтае злучэнне здольнае паўплываць на працу эндакрыннай сістэмы, на развіццё, пашкодзіць нервовую і рэпрадуктыўную сістэмы, справакаваць рак. З такім папярэджаннем выступіў Арнольд Шэктэр, супрацоўнік Тэхаскай школы грамадскага здароўя. Паводле яго слоў, ён ужо даўно знаходзіць розныя хімікаты ў прадуктах харчавання. Асабліва спецыяліста хвалююць злучэнні брому і хлору. Яны лёгка назапашваюцца ў тканках цела. Пры гэтым з такімі злучэннямі людзі пастаянна сутыкаюцца ва ўласным доме. Справа ў тым, што імі апрацоўваюць мэблю і розныя прадметы. А вось аналіз прадуктаў харчавання паказаў: звычайна хімічнае забруджванне назіралася ў тлустых прадуктах (злучэнні тлушчарасшчапляльныя). Самая вялікая канцэнтрацыя аказалася ў кансервах з сардзін, у свежым ласосі, арахісавым масле і цілапіі.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### КНДР АФІЦЫЙНА АБВЯСЦІЛА СЯБЕ ЯДЗЕРНАЙ ДЗЯРЖАВАЙ

**Вярхоўны народны сход КНДР унёс у Канстытуцыю рэспублікі папраўку, згодна з якой краіна афіцыйна абвяшчаецца ядзернай дзяржавай. Прыняцце папраўкі адбылося яшчэ ў красавіку 2012 года. Афіцыйна ж яна была інкарпаравана ў сярэдзіне мая, перадаюць паўночнакарэйскія СМІ.**

Аналітыкі мяркуюць, што падобнае рашэнне тлумачыцца жаданнем Пхеньяна дамагчыся прызнання ў якасці ядзернай дзяржавы з боку сусветнай супольнасці.



Нагадаем, Канстытуцыя КНДР была прынята на сесіі Вярхоўнага народнага сходу рэспублікі ў снежні 1972 года. Раней папраўкі ў асноўны закон краіны ўносіліся ў 1992, 1998 і 2009 гг.

Паўночная Карэя праводзіла выпрабаванні ядзернай зброі ў 2006 і 2009 гг. Міжнародныя назіральнікі і Сеул не выключаюць, што Пхеньян праводзіў таксама падземныя ядзерныя выпрабаванні.

КОРАТКА

Міністэрства эканомікі праводзіць да 10 чэрвеня 2012 года грамадскае абмеркаванне, публічныя кансультацыі новага законапраекта аб цэнаўтварэнні. З гэтай мэтай праект заканадаўчага акта размешчаны на сайце міністэрства і ад грамадскасці прымаюцца прапановы па дакуменце.

Рух цягнікоў праз Каменны Лог у бліжэйшыя дні будзе ўскладнены, паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце Беларусі. Літоўскія пагранічнікі паведамілі беларускім калегам, што 30 мая на пункце пропуску «Мядзінінкай» пачалася рэканструкцыя дарогі, у сувязі з чым на працягу сямі рабочых дзён пропуск грузавых аўтамабіляў будзе ажыццяўляцца толькі па адной паласе. Другое абмежаванне магчыма з 14 чэрвеня.

Выстаўка рэпрадукцый 19 работ Марка Шагала адкрыецца 7 чэрвеня ў Мінску на плошчы Якуба Коласа. Мерапрыемства з'яўляецца часткай праекта «Мастак і горад» па святкаванні ў сталіцы 125-годдзя Марка Шагала.

У выхадныя дні ў Беларусі будзе воблачна, часам пройдуць дажджы, у начныя гадзіны месцамі моцныя, у асобных раёнах магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ноччу плюс 3-10, удзень — 10-17 градусаў.

## ЯКІМ БЕЛАРУСКІМ ТАВАРАМ ВЫ АДДАЯЦЕ ПЕРАВАГУ?



**Абу-Бекір ШАБАНОВІЧ, муфцій мусульманскага рэлігійнага аб'яднання ў Беларусі:**

— Купляем беларускія прадукты, бензін. Бензін параўноўваць не магу, таму што запраўляю машыну толькі беларускім. Аўтамабіль едзе — значыць, добры! Беларускімі прадуктамі мы задаволены. Шмат смачнага хлеба, малочных прадуктаў, асабліва мне падабаюцца сыры... На жаль, рэдка ў краме ўбачыш беларускія яблыкі, усе больш замежныя, а яны не такія духмяныя! Сёння ў Беларусі набірае тэмпы вытворчасць халяльнай (вырабленай з малітвай) мясной, малочнай і іншай прадукцыі, попыт на якую расце не толькі ў нашай краіне, але і ва ўсім свеце сярод веруючых мусульман.



**Ганна ІЗОТАВА, маці шасцярых дзяцей:**

Прадукты харчавання мы кожны дзень набываем толькі беларускія. Спрабавалі карыстацца і беларускім пральным парашком, але перайшлі на імпартны. А вось беларускі халадзільнік спраўна працуе ўжо некалькі гадоў. Нашы халадзільнікі самыя надзейныя, калі мы набывалі халадзільнік, то нават не разглядалі замежныя.



**Юрый КРАСНОЎ, маёр міліцыі:**

Нядаўна набыў сабе красоўкі BELKELME і вельмі задаволены. Я ўжо прывык часта мяняць спартыўны абутак — нагрузак не вытрымлівае. А вось беларускія красоўкі мяне сапраўды здзівілі — вельмі якасныя аказаліся. Яшчэ набылі для дзетак дзве беларускія тахты, але, здаецца, падкручваць некаторыя шрубы ўсё ж давядзецца.

Калі ж гаварыць пра прадукты харчавання, то мы купляем толькі беларускія. Бывала, што набывалі і імпартныя, але, калі прызнацца, часцей шкадавалі «выкінутых» грошай. А вось беларускую бытавую тэхніку мы не купляем, аддаём перавагу нямецкай і японскай, яны — лепшыя на рынку. Напрыклад, тыя ж тэлевізары. Купілі беларускі — працаваў даволі доўга, але зламаўся, і выкінулі. А мама амаль трыццаць гадоў таму набыла японскі — па сённяшні дзень працуе!

**Падрыхтавала Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# ПРАВА НА ЖЫЛЛЁ

## Уласны дом

Дзеля зацікаўленасці людзей у будаўніцтве індывідуальных жылых дамоў дзяржава возьме на сябе распрацоўку праектаў забудовы тэрыторый, будаўніцтва пад'язных дарог і сацыяльных аб'ектаў першай неабходнасці. За кошт сродкаў бюджэту і пастаўшчыкоў паслуг на працягу 3 гадоў у цэнтральную частку новага жыллёвага раёна будзе падводзіцца газ, вада, электраэнергія з уладкаваннем цэнтральных размеркавальных установак. За кошт уласных сродкаў грамадзяне будуць будаваць вулічную інжынерна-транспартную інфраструктуру.

«Такім чынам для развіцця гэтых тэрыторый будзе выкарыстоўвацца дзяржаўнае і прыватнае партнёрства, — сказаў намеснік прэм'ер-міністра. — Тут вельмі важна садзейнічанне мясцовых улад на ўсіх этапах — ад выбару ўчастка да растэрміноўкі аплаты за будаўнічыя матэрыялы».

Такія захады дазволяць павялічыць долю індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва да 50% у 2015 годзе (сёння яна складае 30%).

## Гарады-спадарожнікі

Жыллёвае пытанне Мінска і абласных цэнтраў плануецца вырашаць з дапамогай прыгарадаў. Там, дзе колькасць насельніцтва менш за 20 тысяч чалавек, можна будзе разлічваць на значную дапамогу дзяржавы пры будаўніцтве дома або кватэры. Сёння распрацаваны генеральныя планы забудовы Смалявіч і Заслаўя, вядуцца праектныя работы, пасля чаго будуць адведзены зямельныя ўчасткі. Для стварэння аб'ектаў інжынернай, транспартнай і сацыяльнай інфраструктуры толькі ў прыгарадзе Смалявіч спатрэбіцца больш за 3 трл рублёў.

## Дзяржаўны заказ

З 2013 года будаўніцтва жылля з дзяржаўнай падтрымкай будзе ажыццяўляцца на падставе дзяржзаказу. Маецца на ўвазе, што заказчыкі, якімі выступяць упраўленні капітальнага будаўніцтва выканкамаў, за крэдытныя рэсурсы і сродкі мясцовых бюджэтаў пабудуюць жыллё для льготных катэгорый без удзелу насельніцтва. «Чаргавікі» будуць купляць ужо гатовае жыллё з адначасовым пераафармленнем банкаўскага крэдыту.

— Гэта дазволіць пазбегнуць праблем, звязаных са зменай тэрміну будаўніцтва і іх кошту, кантроль за першым і другім будзе ажыццяўляць дзяржава, — заўважыў Анатоль Калінін.

Падчас сумеснага пасяджэння Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Анатоль Калінін і міністры адказалі на пытанні дэпутатаў. Былі закрануты тэмы культуры паслуг у грамадскім транспарце, у прыватнасці, маршрутных таксі, а таксама нявырашаныя пытанні, якія датычацца інвалідаў, дарог, будаўніцтва жылля, інфраструктуры постчарнобыльскіх пасёлкаў і шэраг іншых. Многія пытанні прадстаўнікі ўрада залічылі ў разрад «хатняга задання».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# У ВАС ЁСЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ ПАВЯЛІЧЫЦЬ СВАЮ ПЕНСІЮ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Алена Святлова, г. Мінск:** *Мой сын атрымлівае пенсію з нагоды страты карміцеля за памерлага бацьку, сёлета заканчвае школу. У ліпені яму спаўняецца 18 гадоў, плануе паступаць у ВНУ. Ці будзе яму прадоўжана выплата пенсіі пасля 18 гадоў і да якога часу?*

**М. А. Шчоткіна:** Дзецям памерлага карміцеля пенсія з нагоды яго страты прызначаецца і выплачваецца да дасягнення імі 18-гадовага ўзросту. У выпадку іх навучання на дзённай форме атрымання адукацыі ва ўстановах, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, у тым ліку на падрыхтоўчых аддзяленнях (акрамя ўстаноў адукацыі, у перыяд вучобы ў якіх навучэнцы знаходзяцца на ваеннай службе, на службе ў органах унутраных спраў, органах і падраздзяленнях па надзвычайных сітуацыях, органах фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю Рэспублікі Беларусь), спецыяльнай адукацыі, перападрыхтоўку кадраў, гэтая пенсія выплачваецца да заканчэння імі такога навучання, але не больш чым да дасягнення ўзросту 23 гадоў. Такім чынам, пенсія вашаму сыну будзе выплачана па ліпень уключна. У выпадку яго навучання на дзённай форме атрымання адукацыі ў адной з вышэйзгаданых устаноў адукацыі выплата пенсіі будзе аднаўлена з даты паступлення на вучобу і будзе выплачвацца да заканчэння навучання, але не больш чым да дасягнення вашым сынам 23 гадоў.

## ШТО ПАВІННА ЎНОСІЦЦА Ў ПРАЦОЎНУЮ КНІЖКУ?

**Алена Біруля, Жодзіна:** *Муж у сакавіку быў у чарговым водпуску, у ліпені хоча ўзяць за свой кошт 2 тыдні. Ці магчыма гэта і ад каго гэта залежыць, ці можна ўзяць 2 тыдні ў лік будучага водпуску?*

**М. А. Шчоткіна:** У гэтай сітуацыі, калі вашым мужам у сакавіку быў выкарыстаны працоўны водпуск за бягучы працоўны год, а новы працоўны год яшчэ не наступіў, магчымасці выкарыстоўваць другі працоўны водпуск няма. Такое паняцце як прадастаўленне свабодных ад працы дзён у кошт будучага водпуску ў заканадаўстве аб працы адсутнічае. У выпадку неабходнасці ў адпаведнасці з арт. 190 Працоўнага кодэкса работніку можа быць прадастаўлены кароткачасовы водпуск без захавання заработнай платы (працягласцю не больш за 30 каляндарных дзён на працягу каляндарнага года).

**Марына, Брэст:** *Раней агучвалася інфармацыя аб тым, што ў Беларусі будуць распрацоўваць сістэму страхавання ад беспрацоўя. На якой стадыі знаходзіцца зараз гэта пытанне? Якая практыка існуе ў іншых краінах? Хто можа разлічваць на такую страхоўку? І ці адрозніваецца яе памер ад стандартнай дапамогі па беспрацоўі?*

**М. А. Шчоткіна:** Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны сумесна з зацікаўленымі вывучаецца вопыт страхавання беспрацоўя за мяжой. Акрамя таго, у гэтым годзе мы атрымаем першыя вынікі абследавання хатніх гаспадарак па пытаннях занятасці па метадалогіі МАП, што дасць магчымасць ацаніць не толькі зарэгістраванае, але і рэальнае беспрацоўе. Пасля атрымання вынікаў праведзенай працы і будзе прымацца рашэнне аб распрацоўцы сістэмы страхавання ад беспрацоўя.

**Таццяна Пятроўна, Мінск:** *Са мной арганізацыя прадоўжыла кантракт, але кадравік не запісаў гэта ў працоўную кніжку. Ці варта ўносіць у працоўную кніжку работніка звесткі аб тэрміне кантракта пры яго прадаўжэнні?*

**М. А. Шчоткіна:** Прадугледжана ўнясенне ў працоўную кніжку запісу аб заключэнні кантракта. Звесткі аб іншых працоўных дагаворах, што заключаюцца, аб тэрмінах працоўных дагавораў (кантрактаў) уносіць не трэба. Напрыклад, не патрабуецца ўказваць, што кантракт заключаны на год, што тэрмін кантракта падоўжаны, аб тым, што работнік прымаецца на працу на час знаходжання асноўнага работніка ў водпуску па цяжарнасці і родах і г.д.

**Іван Мікалаевіч, Магілёў:** *У нашым калектыўным дагаворы маецца пункт аб індэксацыі зарплаты, а заробак — не індэксуецца! Куды скардзіцца? Як будзе пакараны наймальнік і службовая асоба? Ці будуць здзейснены ў рэшце рэшт законныя выплаты?*

**М. А. Шчоткіна:** У адпаведнасці з арт. 375 Працоўнага кодэкса кантроль за выкананнем калектыўнага дагавора ажыццяўляецца бакамі, а таксама спецыяльна ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі нагляду і кантролю за выкананнем заканадаўства аб працы. У сувязі з гэтым работнік — член прафсаюза па абарону сваіх інтарэсаў, у першую чаргу, можа звярнуцца ў пярвічную прафсаюзную арганізацыю, а таксама да наймальніка. У выпадку ўзнікнення працоўнай спрэчкі аб невыкананні ўмоў калектыўнага дагавора неабходна звярнуцца ў камісію па працоўных спрэчках, суд. Выплаты, прадугледжаныя калектыўным дагаворам, могуць быць ажыццёўлены ў адпаведнасці з рашэннем камісіі па працоўных спрэчках або судовым рашэннем.

За невыкананне абавязацельстваў, прадугледжаных калектыўным дагаворам, бакі нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам, калектыўным дагаворам.

**Іван, Мінск:** *Хто павінен азнаёміць супрацоўніка, што паступіў на працу, з калектыўным дагаворам, які дзейнічае ў арганізацыі?*

**М. А. Шчоткіна:** У адпаведнасці з заканадаўствам гэты абавязак, у першую чаргу, ляжыць на наймальніку, які ў адпаведнасці з арт. 373 Працоўнага кодэкса павінен азнаёміць усіх работнікаў, у тым ліку і зноў прынятых, з дзейным у арганізацыі калектыўным дагаворам і пагадненнямі. Акрамя таго, у адпаведнасці з Законам «Аб прафсаюзах», гэты абавязак ускладаецца таксама і на прафсаюз.

**Святлана БУСЬКО.**

■ Прыёмная кампанія-2012

# АБІТУРЫЕНТЫ, БЕРАЖЫЦЕ СВОЙ ПАШПАРТ!

**Сёння ў Беларусі завяршаецца рэгістрацыя на цэнтралізаванае тэсціраванне. Пункты рэгістрацыі закрыюцца ў 19.00. Трэба мець на ўвазе, што да закрыцця пунктаў рэгістрацыі ў абітурыентаў яшчэ застаецца магчымасць здаць атрыманы раней пропуск на ЦТ ці абмяняць яго на пропуск па іншай дысцыпліне. Гэта можа спатрэбіцца, напрыклад, тым абітурыентам, якія пераарыентаваліся на іншую спецыяльнасць, дзе набор экзаменацыйных дысцыплін крыху іншы.**

Нагадаем, што летась на штурм ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў адважыліся 150 тысяч чалавек. Сёлета за тры дні да заканчэння рэгістрацыі для ўдзелу ў ЦТ зарэгістраваліся ўсяго 124,8 тысячы чалавек. Самай масавай дысцыплінай цэнтралізаванага тэсціравання заўсёды была матэматыка, аднак сёлета лідзіруе руская мова, куды зарэгістраваліся 84 тысячы чалавек. А беларускую мову збіраецца здаваць усяго 41 тысяча абітурыентаў — удвая менш. Такім чынам, беларуская мова працягвае здаваць свае пазіцыі. Другая па масавасці дысцыпліна ЦТ — матэматыка (больш як 83 тысячы чалавек).

Цэнтралізаванае тэсціраванне стартуе сёлета 13 чэрвеня. У гэтым годзе час, які адводзіцца на выканне тэстаў, застаўся ранейшым, як, дарэчы, і колькасць заданняў па кожным прадмеце. Аднак у тэстах па геаграфіі, гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі навейшага часу і грамадазнаўстве змяніліся суадносіны заданняў у абласцях А і В. У прыватнасці, колькасць заданняў вобласці А (калі абітурыенту прапануюцца некалькі варыянтаў адказаў) зменшылася да 38, а колькасць заданняў без падказак вобласці В павялічылася да 12.

Арганізатары цэнтралізаванага тэсціравання папярэджваюць, што для таго, каб трапіць на ЦТ, акрамя пропуску, абітурыенты абавязкова павінны мець з сабой дакумент, які сведчыць іх асобу: гэта можа быць пашпарт, пасведчанне на права жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь, пасведчанне бежанца ці даведка органаў унутраных спраў, якая выдаецца ў выпадку страты (крадзяжу) дакумента. Тлумачэнні кшталту «мой пашпарт у пасольстве» пад увагу брацца не будуць. Вадзіцельскае пасведчанне таксама для праходжання тэсціравання не падыходзіць.

— Гэта не наш капрыз, — тлумачыць **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ**. — Пералік дакументаў, якія сведчаць асобу грамадзяніна, зацверджаны ўказам кіраўніка дзяржавы. Да таго ж, калі вы плануеце сёлета паступаць, то павінны вырашыць загадзя, што для вас больш важна: гарантаваны летні адпачынак, замежная камандзіроўка з адкрытай візай ці здача іспытаў у ВНУ?

Для абітурыентаў, якія прапусцяць ЦТ у асноўны дзень, прадугледжаны адзін рэзервовы дзень — 4 ліпеня. Але здаць у рэзервовы дзень можна будзе толькі адну дысцыпліну. Прычым абітурыентам давядзецца даказваць спецыяльнай камісіі з дакументамі ў руках, што прычына пропуску ЦТ і сапраўды была ўважлівая. Рэгістрацыя для ўдзелу ў рэзервовы дзень будзе праходзіць з 27 чэрвеня па 1 ліпеня.

**Надзея НІКАЛАЕВА** ■

# З МЯЧОМ — НА КАНІКУЛЫ!

**Аляксандр Пракапенка, Георгій Кандрацьеў, Сяргей Кісляк, Леанід Ковель... Гэтыя імёны аб'ядноўвае не толькі ўсімі любімая гульня — футбол, але і тое, што ўсе яны выйшлі з глыбінкі, палюбілі бегаць з мячом па полі яшчэ са школы.**



Фота БЕЛТА.

Папулярызаваць футбол з нізоў вырашыла і Беларуская федэрацыя футбола пры падтрымцы Міністэрства адукацыі, ААТ «Белаграпрамбанк» і прадпрыемства «Санта Брэмар», арганізаваўшы акцыю «Падары дзіцяці футбольны мяч!». Напярэдадні летніх канікулаў, чэмпіянату Еўропы-2012 і Алімпійскіх гульняў на святочных лінейках 30 і 31 мая першакласнікам усіх беларускіх сельскіх школ былі ўручаны футбольныя мячы. Прадстаўнікі акцыі наведалі 2113 школ і ўручылі 18409 мячоў. Выбар паў менавіта на сельскія школы, бо не сакрэт, што ў вёсках бацькам нашмат складаней купіць мяч свайму дзіцяці, а як паказвае практыка, менавіта ў аддаленых ад сталіцы раёнах часта выхоўваюцца сапраўдныя будучыя прафесіяналы сваёй справы.

Як адзначыў **намеснік прэм'ер-міністра Беларусі, старшыня Беларускай федэрацыі футбола Сяргей РУМАС**, «калі краіна хоча, каб у прафесійным футболе ў яе былі поспехі, трэба ўкладваць грошы ў дзіцячы футбол. Мы спадзяёмся, што сярод 18 тысяч першакласнікаў, якія сёння атрымалі мячы, абавязкова знойдуцца тыя, хто праславіць нашу Радзіму ў прафесійным спорце. Зараз галоўная задача бацькоў — адагнаць сваіх дзяцей ад камп'ютараў і дапамагаць ім вярнуцца на вуліцы з мячом». Акрамя таго, Сяргей Мікалаевіч паведаміў, што цяпер разам з Міністэрствам адукацыі абмяркоўваецца пытанне аб павелічэнні колькасці заняткаў фізічнай культурай у школе. Аднак пакуль паўстае праблема: у такім выпадку неабходна скарачаць гадзіны якога-небудзь іншага прадмета. А сучаснаму чалавеку, акрамя спартыўнай падрыхтоўкі, патрэбна яшчэ добра ведаць мову, матэматыку, іншыя агульнаадукацыйныя дысцыпліны.

Гэта прагучала на сустрэчы з першакласнікамі ў Тураве. Арганізатары акцыі наведалі «апошнія званкі» ў дзвюх мясцовых школах, павіншавалі выпускнікоў, а таксама ўручылі падарункі самым малодшым вучням. Прадстаўнікі Белаграпрамбанка разам са сваім рэкламным персанажам Агрыкам падарылі дзяўчынкам і хлопчыкам прыгожыя мячы. Дарэчы, гэта не першая дапамога ад банка. Так, напрыклад, для сярэдняй школы №1 г. Турава быў абсталяваны сучасны камп'ютарны клас, які дапаможа вучням лепш авалодаць ведамі і навыкамі, неабходнымі для далейшай вучобы і прафесійнай дзейнасці. Таксама прыемнай навіной стала тое, што Белаграпрамбанк вырашыў аплачваць вучобу ў вышэйшых навучальных установах самым адораным дзецям. «Мы далі даручэнне ўсім нашым філіялам выбраць адораную моладзь з сем'яў, якія не маюць магчымасці аплачваць навучанне ў ВНУ. Такім маладым людзям мы будзем прапаноўваць паступаць на спецыяльнасці, неабходныя нашаму банку, а пасля набыцця вышэйшай адукацыі па размеркаванні забяром іх да сябе», — адзначыў **старшыня праўлення «Белаграпрамбанка» Уладзімір ПАДКАВЫРАЎ.**

Атрымаўшы прыемныя падарункі, малодшыя школьнікі пабеглі на футбольнае поле забіваць новыя галы. Хто ведае, можа, праз некалькі гадоў дзякуючы менавіта гэтым мячам, атрыманым на школьнай лінейцы, у айчынным і сусветным футболе з'явяцца новыя «зоркі», быць падобнымі на якіх захоча яшчэ адно пакаленне беларускіх школьнікаў...

Арганізатары сустрэчы шчыра спадзяюцца, што акцыя «Падары дзіцяці футбольны мяч!» стане добрай традыцыяй па правядзенні падобных маштабных мерапрыемстваў у нашай краіне, якія паспрыяюць прапагандзе фізічнай культуры і спорту, папулярызацыі здаровага ладу жыцця сярод моладзі.

**Крысціна ШАЛАМІЦКАЯ.**

## «ЗАЛАТЫ» ТЫ МОЙ КАРАСЬ...

Больш за 6,1 мільёна рублёў склала шкода ад незаконна здабытых браканьерам 8 асобін залатога карася, дзвюх — ліня і адной — краснапёркі.

— Жыхара гарпасёлка Рудзенск рэйдавая група Мінскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету затрымала паблізу вёскі Сяргеевічы Пухавіцкага раёна, — распавёў старшы дзяржаўны інспектар Вадзім Варабей. — Той «рыбачыў» на Сяргеевіцкіх разлівах у перыяд забароны на вылаў усіх відаў рыб трыма сеткамі агульнай даўжынёй 55 метраў. Агульная вага ўлову склала 2,2 кілаграма. Браканьеру пагражае крымінальная адказнасць.

Што тут можна дадаць? Хіба толькі, што рыбка тая аказалася сапраўды «залатой»...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# НЕЎЛАДКАВАНЫХ ДЗЯЦЕЙ ВЫЯЎЛЯЮЦЬ І ЖЭС, І МНС...

**ЦЭЛЫ шэраг дзяржаўных структур ажыццяўляе пастаянны маніторынг становішча дзяцей — як унутры арганізаваных калектываў, так і ў сям'і. Дзякуючы маштабнай рабоце краіна дасягнула станоўчых вынікаў у рэалізацыі права малых на дастойны ўзровень жыцця. Для Беларусі не актуальныя маштабы, скажам, гандлю дзецьмі, іх уцягванне ў прастытуцыю і парнаграфію. Разам з тым, глыбокага даследавання патрабуе, напрыклад, тэма дзіцяча-падлеткавых суіцыдаў або сацыяльнага сіроцтва, хоць за апошнія гады «краіна сіроцтва» істотна зменшылася...**

У ліку першых станоўчых момантаў, якія адзначаюць спецыялісты, варта назваць запавольванне тэмпаў змяншэння дзіцячага насельніцтва. Калі ў 2008 годзе дзіцячае насельніцтва скарацілася на 37,5 тысячы ў параўнанні з годам 2007-м, то ў 2011-м — на 6,5 тысячы ў параўнанні з 2010-м.

Паводле слоў **начальніка аддзела сацыяльна-педагагічнай работы і абароны дзяцінства Міністэрства адукацыі Беларусі Галіны РУДЗЯНКОВАЙ,** можна назваць пяць асноўных кірункаў у галіне абароны дзяцінства, па якіх Беларусь дасягнула пазітыўных вынікаў, што прызнала міжнародная супольнасць. Гэта комплексная работа па захаванні здароўя маці і дзіцяці. Даступнасць і якасць адукацыі і сацыяльнай абароны. Арганізацыя адпачынку і стварэнне ўмоў для ўсебаковага развіцця. Работа па захаванні і ўмацаванні сям'і, прафілактыка сіроцтва, развіццё сямейных формаў уладкавання тых дзяцей, для каго сям'ю захаваць не ўдаецца, скарачэнне сеткі інтэрнатных устаноў. А таксама абарона дзяцей ад дрэнных умоў выхавання, якасць агульнай сярэдняй і даступнасць вышэйшай адукацыі для дзяцей з сельскай мясцовасці.

Сёння звыш 79 працэнтаў дзяцей дашкольнага ўзросту наведваюць установы дашкольнай адукацыі, і гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў сярод краін СНД. Апярэджвае Беларусь шэраг краін і па ўзроўні адукаванасці моладзі — 99,8 працэнта.

Захавана ўнікальная сістэма дадатковай адукацыі — тое, што раней называлася пазашкольным навучаннем. Ва ўстановах дадатковай адукацыі займаецца кожны другі школьнік краіны. 381 установа дадатковай адукацыі дзейнічае ў галіне адукацыі і звыш 500 — у галіне культуры.

За апошнія пяць гадоў скарацілася колькасць сірот — з 28,2 тысячы да 24,7. Закрыліся 23 інтэрнатныя ўстановы для сірот, 9 рэарганізаваны. На 41 працэнт скарацілася колькасць дзяцей, якія выхоўваюцца ў інтэрнатных установах. На 40 працэнтаў зменшылася за час дзеяння Дэкрэта №18 колькасць дзяцей, чыіх бацькоў пазбавілі бацькоўскіх правоў. У тры разы зменшылася колькасць адмоў ад дзяцей.

Да 2016 года асноўнымі кірункамі ў галіне абароны дзяцінства застануцца стварэнне спрыяльных умоў для жыцця і развіцця дзяцей, умацаванне здароўя і садзейнічанне здароваму ладу жыцця, павышэнне якасці дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, забеспячэнне якаснай адукацыі, абарона ад гвалту, гандлю і ўсіх відаў эксплуатацыі, удасканаленне механізмаў абароны правоў, паляпшэнне маніторынгу становішча дзяцей у краіне і кожнай сям'і.

Наогул як толькі дзіця ўключаецца ў сістэму адукацыі, пачынаецца пастаянны маніторынг становішча дзіцяці, адзначае Галіна Рудзянкова. Найперш міністэрствы адукацыі, працы і сацыяльнай абароны, аховы здароўя, унутраных спраў выяўляюць, паводле спецыяльнай інструкцыі, дзяцей, якія маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне. Дакумент змяшчае абавязковыя меры адносна таго, як, каго і ў які тэрмін інфармаваць пры наяўнасці пэўных крытэрыяў. Яшчэ ў 2006-м у Кодэкс аб шлюбе і сям'і быў унесены артыкул «Неналежнае выкананне бацькоўскіх абавязкаў», які акрэсліваў крытэрыі сацыяльна небяспечнага становішча. Прызнаць неўладкаванасць можа савет прафілактыкі ўстановы адукацыі або сацыяльна-педагагічная ўстанова, калі размова ідзе пра дзяцей да 3 гадоў і 9-класнікаў, якія нідзе не вучацца і не працуюць.

Усе дзяржаўныя органы абавязаны інфармаваць аддзелы адукацыі і камісіі па справах непаўналетніх аб неўладкаванасці дзяцей і сем'яў. Пад увагу бяруцца сігналы, якія паступаюць ад суседзяў, інспектараў МНС, якія могуць выявіць, скажам, неналежны стан ацяпляльных установак, ад работнікаў ЖЭСа, якія паведамляюць аб запазычанасцях па камунальных паслугах... Далей па кожным сігнале праводзіцца праверка. Ажыццяўляць яе могуць як прадстаўнікі ўстаноў адукацыі, так і міжведамасныя службы экстраннага рэагавання. Пасля надання сям'і статусу «сацыяльна небяспечнай» распрацоўваецца план дапамогі.

Штомесяц па краіне правяраюцца чатыры раёны, у якіх вывучаецца сістэма работы па выяўленні дзіцячай неўладкаванасці, рэабілітацыі дзяцей і бацькоў, абароне дзіцячых правоў. Пастаянны маніторынг ажыццяўляецца таксама на абласным і рэспубліканскім узроўнях. Ведамасны маніторынг — гэта калі ўсё тое ж Міністэрства адукацыі выяўляе сацыяльную неўладкаванасць сярод навучэнцаў, а Міністэрства аховы здароўя — сярод парадзіх. Апошнім часам да такой работы падключаюцца нават сельсаветы.

Штогод каля 25 тысяч дзяцей трымаюцца ў полі зроку дзяржавы з-за сацыяльнай неўладкаванасці. І для кожнага з іх рэалізуецца індывідуальны план дапамогі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## РАЗЛІЎ БЕНЗІН І ЧЫРКНУЎ ЗАПАЛКАЙ...

Недаравальную неабачлівасць праявіў 24-гадовы жыхар Ляхавіцкага раёна, калі пераліваў бензін з адной ёмістасці ў другую. Малады чалавек рабіў гэта ў кладоўцы сваёй бабулі. Паліва трохі разлілося, і хлопец захацеў асвятліць цёмную кладоўку. Чыркнуў запалкай — і на ім загарэлася адзенне. Ён змог збіць полымя і вывесці з хаты 88-гадовую бабулю. Пенсіянерка не пацярпела, а вось унук атрымаў 20 працэнтаў апёкаў цела. Да прыезду пажарных хата практычна згарэла.

**Яна СВЕТАВА.**

## СІГНАЛІЗАЦЫЯ ПЕРАШКОДЗІЛА

Няўдалай для 23-гадовага грамадзяніна стала начная спроба абрабаваць краму Сенненскага райпа ў вёсцы Забароўе — спрацавала сігналізацыя. Супрацоўнікі РАУС аператыўна прыехалі па выкліку. Высветлілася, што «налётчык» — непрацуючы, раней ужо судзімы за крадзяжы мясцовы жыхар. З крамы спрабаваў вынесці прадукты харчавання, спіртныя напоі і цыгарэты.

## АД МІЛІЦЭЙСКАГА САБАКІ НЕ ЎЦЯЧЫ

Ноччу супрацоўнікі Чашніцкага аддзела аховы падчас патрулявання пры дапамозе службовага сабакі затрымалі злодзея, які абрабаваў цэх дзяржаўнага прадпрыемства. Высветлілася, што 26-гадовы раней судзімы грамадзянін выставіў аконную шыбу і забраўся ў сталярны цэх перасоўнай механізаванай калоны на вуліцы Савецкая. Там скраў электраінструменты агульным коштам 3 мільёны рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## АБЗАЦ

◢ Будаўніцтва аўтадарогі Магілёў — Мінск (М4) будзе завершана да 1 верасня 2012 года, паведаміў учора намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль Калінін.

◢ **У Мінску пачынаюцца работы па добраўпарадкаванні могілак «Крупцы». Могілкі размешчаны па праспекце Пераможцаў. Па звестках гісторыкаў, яны — адны са старэйшых, што захаваліся на тэрыторыі Беларусі. Тут праводзіліся пахаванні з XVI па XX стагоддзе. На могілках будуць уладкаваны пешаходныя дарожкі, лавы, інфармацыйныя стэнды. Усе магілы, што захаваліся, прывядуць у належны выгляд.**

◢ Беспрацоўны са Столінскага раёна за некалькі месяцаў на перапродажы цыгарэт выручыў 656 мільёнаў рублёў. Пры гэтым з адной каробкі (50 блокаў) ён атрымліваў усяго ад 2 да 15 долараў звыш затрат. На амаль прамысловы аб'ём рэалізацыі мужчына выйшаў за кошт куплі цыгарэт па аптовых цэнах у юрыдычных асоб, якія супрацоўнічаюць з тытунёвымі фабрыкамі, і продажу тавару тым, хто займаецца кантрабандай айчынных цыгарэт ва Украіну і Польшчу. Такой супрацьпраўнай дзейнасцю мужчына займаўся са студзеня па красавік 2012 года і атрымаў даход у асабліва буйным памеры.

## ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ **На поўдні Масквы наркапаліцэйскія выявілі поле дзікарослых канопляў. Як паведаміла прэс-служба Федэральнай службы па кантролі за абарачэннем наркотыкаў, у раёне адной са станцый метро мясцовыя ўлады добраўпарадкавалі прылеглую тэрыторыю, для чаго быў закуплены грунт. Аднак праз некаторы час на адрас наркакантролю паступіла інфармацыя пра дзіўную расліннасць. Высветлілася, што замест газона ўзышлі каноплі. У ходзе аперацыі было выкапана 230 кустоў наркатычнай расліны. Цяпер шукаюць пастаўшчыка грунту.**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

**ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА**

**объявляет о проведении повторных публичных торгов по продаже имущества, принадлежащего КТУП «Нарочь курортторг»**

**Лот № 1.** Капитальное строение, здание магазина № 12 со складом, инв. № 633/С-10591, общей площадью 41,3 кв. м, стоимостью 17 496 150 белорусских рублей, расположенное по адресу: Минская область, Мядельский район, Занарочский с/с, д. Стаховцы;

**Лот № 2.** Капитальное строение, здание магазина № 9 со складом, инв. № 633/С-10589, общей площадью 40,7 кв. м, стоимостью 15 894 450 белорусских рублей, расположенное по адресу: Минская область, Мядельский район, Занарочский с/с, д. Черемщицы;

**Лот № 3.** Капитальное строение, здание магазина, инв. № 633/С-10590, общей площадью 51,3 кв. м, стоимостью 9 313 800 белорусских рублей, расположенное по адресу: Минская область, Мядельский район, Занарочский с/с, д. Карабаны.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества.

**Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk. court.by/,**

а также в помещении хозяйственного суда г. Минска: г. Минск, ул. Академическая, 15/1.

**Торги состоятся 22.06.2012 года в 12.00 по адресу: Минская область, Мядельский район, г. Мядель, пл. Ленина, 1.**

**За дополнительной информацией обращаться:**

**судебный исполнитель Минец И.Н., тел./факс: 294 93 66;**

**ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294 93 67.**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» Минск, код 795, УНП 101541763 хозяйственного суда города Минска не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

# НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## КАБ ЗАМЕСЦІ СЛЯДЫ, ПАДПАЛІЛІ ДОМ...

Двое вынеслі з прыватнага дома мінчанкі 19 760 долараў. Пасля гэтага, каб замесці сляды, дом падпалілі. Як паведамілі ва ўпраўленні Следчага камітэта Беларусі па Мінску, адзін з падазраваных — непрацуючы мінчанін 1987 года нараджэння — затрыманы і ўзяты пад варту. У дачыненні да яго і яго саўдзельніка (асоба і месцазнаходжанне апошняга высвятляецца) Ленінскім раённым аддзелам Следчага камітэта заведзены дзве крымінальныя справы — за крадзеж у асабліва буйным памеры і наўмыснае знішчэнне ці пашкоджанне маёмасці. Сума ўрону, нанесенага пацярпелай, устанаўліваецца.

**Надзея ДРЫЛА, Сяргей РАСОЛЬКА.**

## КАРОВЫ БЕЗ ДАКУМЕНТАЎ

Мікрааўтобус, які перавозіў буйную партыю кантрабанднай ялавічыны, затрыманы на трасе паміж Маларытай і Кобрынам. У машыне 27-гадовы жыхар Валынскай вобласці, грамадзянін Украіны, вёз 40 туш буйной рагатай жывёлы. Дакументаў на груз кіроўца прад'явіць не змог, як і растлумачыць памежнікам паходжанне мяснога «грузу». Таму дзве тоны ялавічыны на суму 128 мільёнаў рублёў канфіскаваны.

**Яна СВЕТАВА.**

## «САЦЫЯЛЬНЫЯ РАБОТНІКІ» ЗАТРЫМАНЫ ПА ГАРАЧЫХ СЛЯДАХ

29 мая дзве жанчыны пад маркай сацыяльных работнікаў праніклі ў кватэру мінчанкі 1933 года нараджэння і скралі ў яе 200 долараў і 400 тысяч беларускіх рублёў. Пацярпелая адразу ж пасля таго, як заўважыла прапажу, звярнулася ў міліцыю... Псеўдасацыяльнымі работнікамі аказаліся цыганкі з Данецка і Арэхава-Зуева, якіх нарад Першамайскага аддзела Дэпартамента аховы МУС затрымаў па гарачых слядах. У дачыненні абедзвюх заведзена крымінальная справа за крадзеж. І не адна... Высветлена, што затрыманыя ў той жа дзень аналагічным чынам скралі 800 тысяч беларускіх рублёў і залаты пярсцёнак у пенсіянеркі з Заводскага раёна. Паводле слоў афіцыйнага прадстаўніка ўпраўлення Следчага камітэта Беларусі па Мінску Аляксандра ГЕРАСІМАВА, падазраваныя ўзятыя пад варту, правяраецца верагоднасць здзяйснення імі іншых крадзяжоў.

**Надзея ДРЫЛА.**

## ПРЫ ДЭМАНТАЖЫ АПЫНУЎСЯ ПАД ЗАВАЛАМ

У Докшыцкім раёне пры самавольным дэмантажы будынку, які не эксплуатаваўся, пад заваламі апынуўся мужчына. Пацярпелага выратавалі работнікі МНС. Пра здарэнне ў вёсцы Круляўшчызна і неабходнасць аказання дапамогі чалавеку выратавальнікам паведамілі ў шэсць гадзін вечара. На месцы высветлілася, што абрынулася бетонная пліта ў цагляным аднапавярховым будынку, які быў у стадыі разборкі. Заціснула 53-гадовага мясцовага жыхара. Выкарыстаўшы механізаванае аварыйна-выратавальнае абсталяванне, супрацоўнікі МНС дэблакіравалі пацярпелага і перадалі брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі. Са шматлікімі пераломамі яго даставілі ў рэанімацыйнае аддзяленне Докшыцкай цэнтральнай раённай бальніцы. Стан мужчыны ацэньваецца як стабільна цяжкі. У Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях паведамілі, што пацярпелы разам з сужыцелькай дэмантаваў будынак для асабістых патрэб.

**Сяргей РАСОЛЬКА, Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ЁН УМЕЎ СУЦЯШАЦЬ...

**Сёння спаўняецца 40 дзён, як Гомельская епархія асірацела. Так, менавіта 40 дзён таму адышоў да Бога архіепіскап Гомельскі і Жлобінскі Арыстарх. Адразу пасля яго смерці было шмат эмоцый, якія, верагодна, не давалі магчымасці асэнсаваць, якую ролю гэты чалавек адыграў у адраджэнні праваслаўя ў паўднёвым рэгіёне Беларусі, адкуль ён сам быў родам.**



Гэта яму давялося ў самым канцы 80-х прыняць на свае плечы епархію, якой тады насамрэч і не было. Гэта ён адстойваў правы вернікаў на Гомельскі кафедральны сабор святых першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла — былы планетарый, які ў той час стаяў практычна разбураны і спустошаны. Калісьці мне прыйшлося пісаць пра гісторыю сабора. Памятаю, уладыка Арыстарх расказваў пра такую сітуацыю: у час, калі адны добраўпарадкоўвалі будынак і тэрыторыю навокал, іншыя танцавалі на пляцоўцы літаральна побач з храмам. І ў тыя часы ён знаходзіў асобасны падыход да людзей на высокіх пасадах, ад якіх вельмі многа залежала... Менавіта тады рабіліся самыя першыя крокі насустрач паміж уладамі свецкімі і духоўнымі... Дарэчы, калі ў 1991 годзе памёр 53-гадовы старшыня Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Грахоўскі, святары прыйшлі да яго труны і заспявалі «вечную памяць» (тады ва ўсіх, хто прысутнічаў, быў шок). Уладыка Арыстарх казаў, што заўсёды былі людзі, якія з вялікім разуменнем ставіліся да Царквы.

Мне давялося звяртацца да гэтага чалавека не адзін дзясятак разоў. Часцей за ўсё — выконваючы службовыя абавязкі. Але ж былі і сітуацыі, калі ён мне асабіста сапраўды дапамагаў, і не толькі парадамі, малітвамі... У тым ліку і рашэнне аб тым, каб перайсці на цяперашняе месца працы, прымалася не без блаславення архіепіскапа Арыстарха. Яго прысутнасць тут, з намі, адчуваюць многія дагэтуль. У тым ліку тыя, хто працаваў побач, ведаў яго звычкі і рысы характару. Дарэчы, Гомель даведаўся ў дзень пахавання, што ўладыка Арыстарх любіў белыя ружы. Іх неслі яму ў дзень развітання бясконца... Цяпер пра яго ўспамінаюць тыя, хто ведаў яго на працягу доўгіх гадоў...

**Настаяцель Гомельскага Свята-Петра-Паўлаўскага сабора протаіерэй Іаан Лендл на працягу доўгага часу выконваў абавязкі сакратара архіепіскапа Арыстарха, часта разам з ім ездзіў у камандзіроўкі:**

— Для ўладыкі Арыстарха маці была святым чалавекам. Было шмат выпадкаў, калі людзі да яго звярталіся, і калі нехта дрэнна адгукаўся аб сваёй маці, уладыка прыпыняў яго. Казаў: маці — святы чалавек, якой бы яна ні была. Ён ведаў па імёнах практычна ўсіх дзяцей нашых святароў. Не так даўно мы былі ў Маскве, і ўладыка ў краме пабачыў мельхіёравыя лыжачкі з імёнамі. Ён перабраў і купіў для падарункаў іх шмат — усе, на якіх былі імёны дзяцей святароў нашай епархіі. Я не памятаю, каб уладыка адмовіў у нейкай просьбе, калі чалавек сапраўды меў у гэтым патрэбу. Ён даставаў грошы і казаў мне: едзь, купі ці аплаці тое, што трэба. Магу сказаць дакладна, што гэты чалавек быў празарлівым. Я быў 16 гадоў побач з ім і сутыкаўся з такімі праявамі пастаянна — нават у бытавых рэчах. І ў духоўных гэта таксама мела месца. Уладыка ў сваіх пропаведзях пастаянна звяртаўся да сямейных каштоўнасцяў. Верагодна, гэта звязана з тым, што ён сам быў малодшым сынам у вельмі набожнай сям'і: маці пасля смерці бацькі ад тыфу выхавала 8 дзяцей адна. Ён вельмі любіў і сваю маці, і братоў з сёстрамі. Уладыка расказваў, што яго маці, калі стаяла пад вянцом, прасіла толькі аднаго: каб дзеці былі вернікамі. І малітва была пачута: з гэтай сям'і выйшлі тры манахі. І астатнія пражылі жыццё, за якое не сорамна.

**Протаіерэй Міхаіл Драздоў на працягу некалькіх гадоў узначальваў канцылярыю Гомельскай епархіі:**

— «Строгасць трэба разбаўляць цеплынёю любові» — гэтыя словы свяціцеля Феафана-затворніка ўладыка Арыстарх заўсёды ўвасабляў у жыццё. Ён, зразумела, сачыў за тым, каб была дысцыпліна і святары выконвалі свае абавязкі. Часта ён казаў так: зразумейце, ад вас патрабуецца не шмат. Асноўнае — каб чалавек, які да вас звярнуўся, адышоў ад вас суцешаным. Быў такі выпадак, калі святар адмовіўся служыць індывідуальны малебен, бо вельмі стаміўся. Уладыка гаворыць: «Усё роўна трэба было выслухаць, паспачуваць і памаліцца разам. Да людзей трэба ставіцца ўважліва». Уладыка даравау, калі чалавек разумеў сваю памылку, каяўся і прасіў прабачэння. Многія ніколі больш не паўтаралі сваіх дрэнных учынкаў пасля размовы з нашым архіепіскапам. Я памятаю, як ён казаў: «Паглядзі праваслаўны каляндар: там на кожны дзень ёсць настаўленне. Вазьмі за правіла: чытай яго кожны дзень і думай над ім». Святарам, якія не ведаюць, што казаць на пропаведзі, раіў: «Кажыце пра тое, аб чым вы цяпер думаеце. А думаць вы павінны так, каб евангельская ісціна, слова Божае ўнутры вас было жывым і дзейсным штодзень».

**Архімандрыт Амвросій (Шаўцоў), настаяцель Гомельскага Свята-Нікольскага мужчынскага манастыра:**

— У першую чаргу ён быў манахам. Сваё архіерэйскае служэнне ён успрымаў як крыж. Ён пастаянна прыходзіў а палове шостай раніцы на брацкі малебен у манастыры, любіў манаскі спеў і нават калі наведваў свецкія мерапрыемствы, заўсёды быў у малітве. Нас як манахаў ён вучыў быць вернымі Праваслаўнай Царкве, вучыцца пакаянню, малітве, асабліва ў апошнія дні свайго жыцця. Ён і адышоў да Бога падчас начной малітвы, на каленях перад абразамі. Адпявалі яго па манаскім чыне і пахавалі па завяшчанні ў манаскім адзенні ў манастыры.

**Архіепіскап Гомельскі і Жлобінскі Арыстарх на ўрачыстым адкрыцці Пасхальнага фестывалю ў Гомелі, якое адбылося перад самай яго смерцю, так звярнуўся да людзей:**

— У кожнага з нас ёсць тры дні нараджэння: калі маці ў пакутах нарадзіла, калі хрысцілі і калі мы будзем пераходзіць з гэтага жыцця ў вечнае. Уваскрэсенне Бога адкрыла для нас шлях у вечнасць. Перад сваімі пакутамі Хрыстос сказаў: «Запаведзь новую даю вам: любіце адзін аднаго». Вось і вы жадайце дабра і рабіце дабро! Шкадуйце адзін аднаго. Такім чынам мы выканаем закон Божы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

■ Пачынаецца з любові

# «ЛІТАРАТУРА — І ШЧАСЦЕ, І ГОРА МАЁ...»

**...Старая цагляная школа прыцягальна ззяе вокнамі, у якіх адлюстроўваецца вясновае сонца. На акуратнай пляцоўцы перад ёй — надпіс на асфальце: «Выпуск 2011 года». Вясковыя аднапавярховыя домікі стаяць побач у акружэнні пладовых, пакуль яшчэ аголеных дрэў. Усё, здавалася б, як звычайна, як у любой больш-менш вялікай беларускай вёсцы. Але і вёска гэта — Мётча — не самая звычайная, і школа няпростая. Дастаткова сказаць, што яна прызнавалася і лепшай беларускамоўнай школай Барысаўскага раёна, і лепшай беларускай вясковай школай. Сёння мой шлях ляжыць менавіта сюды, а дакладней, у школьны музей з гучнай назвай «Літаратурны космас Мётчы». Хаця пасля таго, як з музеем пазнаёмішся, як паслухаеш аповед яго заснавальніка Уладзіміра Піліпавіча Лайкова, назва ўжо не здаецца надта гучнай. Разумееш — яна цалкам апраўданая. У гэтым сціплым пакоі прадстаўлены сапраўдныя скарбы літаратурнага космасу Беларусі.**



Калі я патэлефанавала настаўніку Мётчынскай школы, колішняму яе дырэктару Уладзіміру Лайкову, то замест звыклых гудкоў у тэлефоне пачула песню ў выкананні Леаніда Барткевіча. «Трэба дома бываць часцей, трэба дома бываць не госцем», — заклікаў знаёмы з дзяцінства голас. Так, яшчэ да таго, як сесці ў электрычку, каб даехаць да станцыі Навасады, а потым да Мётчы, я зрабіла першы крок у гэты незвычайны музей, экспазіцыя якога ўражвае, захапляе, запамінаецца назаўсёды.

Школьны музей быў заснаваны ў 1984-м годзе. Адымі з першых яго гасцей сталі пісьменнікі Алег Лойка, Кузьма Хромчанка, Вячаслаў Рагойша, Анатоль Вярцінскі. «Са шчырым хваляваннем вітаем настаўнікаў і вучняў Мётчынскай школы. Няхай жа спрыяе вам у вучобе і працы літаратура наша родная, няхай натхняе, выхоўвае рукі і сэрцы! Дзякуй вам за сустрэчу, хлеб-соль, гасціну!» — такі запіс пакінулі беларускія літаратары ў «Кнізе ганаровых гасцей». Кніга з таго часу «разраслася» і ўжо не ўмяшчаецца ў адзін том — столькі пісьменнікаў, іншых вядомых людзей тут пабывала. Так, кампазітар Ігар Лучанок пакінуў «музычны» запіс у выглядзе нот да песень, блізкіх і зразумелых кожнаму беларусу: «Мой родны кут» і той самай «Трэба дома бываць часцей». Тут яшчэ шмат запісаў — шчырых, удзячных, з пажаданнямі поспехаў.

**— Чаму менавіта такая назва ў музея — «Літаратурны космас Мётчы»?** — пытаюся ва Уладзіміра Піліпавіча.

— Назва з'явілася не адразу, — усміхаецца суразмоўца. — На маю думку, паміж усімі пісьменнікамі — Купалам, Коласам і тымі, хто толькі сёння нараджаецца як пісьменнік, — існуе касмічная сувязь. Адсюль і назва.

Вось так, праз музей, Уладзімір Лайкоў ішоў да ажыццяўлення сваёй мары, свайго запаветнага жадання — злучыць дзень учарашні, сённяшні і заўтрашні, сабраць пад адным дахам увесь літаратурны «мядоцкі матэрыял». Так, тутэйшыя жыхары называюць сябе не мётчынскімі ці неяк інакш, ад назвы Мётча. Яны гавораць аб сабе: «Мы, мядоцкія», а свой рэгіён называюць Мядоцкім краем, і ўжо даволі даўно праводзіцца фестываль «Мядоцкі край і яго таленты».

Уладзімір Піліпавіч Лайкоў таксама даўно стаў тутэйшым, мядоцкім, хоць родам ён з суседняй Крупшчыны, якую таксама не забывае. З захапленнем расказвае пра сваіх настаўнікаў — Івана Ісакавіча Рабкова, Івана Дзмітрыевіча Антонава. Дзякуючы ім вучні Абчугскай школы сустракаліся з беларускімі пісьменнікамі, даведваліся пра невядомыя старонкі жыцця Якуба Коласа (такімі даследаваннямі займаўся Іван Рабкоў), знаёміліся са светам вялікай літаратуры. Потым быў філалагічны факультэт БДУ, дзе Уладзімір Лайкоў стаў адным з аўтараў альманаха «Пісьменнікі і БДУ», выдадзенага да 50-годдзя ўніверсітэта. Тады ён атрымаў заданне падрыхтаваць матэрыялы пра былых выпускнікоў Белдзяржуніверсітэта: Івана Навуменку, Генадзя Бураўкіна, Івана Пташнікава і Рыгора Барадуліна.

Дарэчы, адзін са стэндаў музея «Літаратурны космас Мётчы» прысвечаны творчасці Рыгора Барадуліна. Тут сабрана больш за паўсотню яго кніг, многія — з аўтографамі. А называецца стэнд «Хай зорам зарыцца над Мётчай» (гэта радкі самога паэта). Хаця, калі ісці з самага пачатку, то першым будзе стэнд з назвай, узятай са знакамітага верша Янкі Купалы: «Ад прадзедаў спакон вякоў мне засталася спадчына». Гэта кнігі і дакументы па гісторыі Беларусі, асобна — Барысаўскага раёна і Мядоцкага краю. Тут ёсць, зразумела, кніга Уладзіміра Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі», стаяць кнігі «Памяць», прысвечаныя розным раёнам Беларусі, «Беларускі народны каляндар», «Белавежская пушча», «Лексічны атлас беларускіх народных гаворак». Ёсць тут і кніга, якая называецца «Мы — беларусы», а ў ёй звесткі пра Уладзіміра Піліпавіча, пра яго радавод, складанню якога ён прысвяціў нямала часу.

...У такім прыгожым, паэтычным краі, як Мядоцкі, не могуць не нараджацца творцы. Яны прадстаўлены на асобным стэндзе: Міхаіл Вінакураў, Бранiслаў Ермашкевіч, Алесь Нінько, Янка Лайкоў... Так, паэт Іван Лайкоў або Янка, — сын Уладзіміра Піліпавіча. Праўда, яго зборнікі, прадстаўленыя на стэндзе, пакуль не падпісаны. Затое тут ёсць вершы яго жонкі Марыны Помаз. Ёсць партрэт Янкі, выкананы таксама ёю і ёсць карціна, на якой — сям'я крэпкіх баравічкоў.

— Намалявана з натуры, — расказвае Уладзімір Піліпавіч. — Аднойчы мы з жонкай Любоўю Фёдараўнай адшукалі ажно дванаццаць баравікоў з адной грыбніцы. Усе знаёмыя дзівавалiся, а нявестка вось намалявала.

Грыбы — асобная гісторыя ў жыцці Уладзіміра Лайкова, яго вялікае захапленне. Ён нават калісьці напісаў эсэ «У палоне грыбной паэзіі», надрукаванае ў часопісе «Полымя». Ёсць ва Уладзіміра Піліпавіча іншыя работы, напісаныя ім асобна ці разам з сынам. Адна з іх — «І зоры над Бярэзінай-ракой», своеасаблівая літаратурная энцыклапедыя Барысаўшчыны. Ёсць яна і ў музеі, дзе ўсяго сабрана некалькі соцень кніг, многія — уласнасць самога Уладзіміра Лайкова. А дома ў яго яшчэ каля дзвюх тысяч сямісот тамоў.

— Можа, наш музей і не мае таго бляску, як у вялікіх музеях, але ў ім ёсць душа, — кажа настаўнік, выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь. — У першую чаргу гэта музей для вучняў. Не ў тым сэнсе, што праводзім тут класічныя экскурсіі — мы не ідзём гэтым звыклым, зацяганым шляхам. Затое арганізуем сустрэчы з пісьменнікамі, з вядомымі людзьмі, праводзім тут адкрытыя ўрокі. І наогул, дзеці самі часта ў музей заходзяць, малодшыя дык лічаць яго бібліятэкай, хаця яна — у суседнім пакоі. Вось учора прыбеглі: «У вас ёсць «Настаўнік чарчэння» Навуменкі»? Мы рыхтуем пераказ». Толькі аднойчы, калі быў яшчэ дырэктарам, я «скарыстаўся» сваім службовым становішчам — выдзеліў гэты клас пад музей. Ён мае выхаваўчы патэнцыял, я ў гэтым перакананы. І вучні нашы ведаюць, што я магу пракансультаваць іх па кожным творы, па кожным пісьменніку.

**— А што для вас літаратура, што яна наогул у жыцці?**

— Дзякуючы літаратуры мы можам навучыцца правільна жыць, — адказвае мой суразмоўца. — Праўда, сёння літаратура ўжо, магчыма, і не выконвае такой ролі, бо жыццё змянілася... Але яна здольная зрабіць чалавека прыгажэйшым, духоўна напоўніць яго жыццё. А для мяне асабіста... Колькі светлых хвілін я перажыў, чытаючы кнігі! Шчаслівы, што і ў сына ёсць паэтычныя задаткі, хаця ў свой час мы з жонкай за яго перажывалі. Літаратура — і шчасце, і гора маё, пэўна. Але ніякага іншага жыцця ўявіць сабе не магу.

**Марына ХІДДЖАЗ.**
**Фота аўтара** ■


## СООО «Барпромэкс»
## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
### по продажи имущества, принадлежащего СООО «Барпромэкс»

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена лота, без НДС, руб. | Задаток 10%, без НДС, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | Автопогрузчик «Komatsy» вилочный, грузоподъемность 4 т, год выпуска 1986, цвет желтый | 56 000 000 | 5 600 000 |
| 2 | Трактор МТЗ 82.1, цвет синий, год выпуска 1984, ТО пройдено | 41 000 000 | 4 100 000 |

Организатор торгов: управляющий в деле о банкротстве ООО «Диспонент»: г. Гомель, ул. Молодости, 5, тел. моб. (8029) 621 22 36, (8029) 684 94 62.

Продавец: СООО «Барпромэкс», г. Гомель, ул. Объездная, д. 9, к. 7.

Задаток перечисляется до 04.07.2012 г. (включительно) на р/с 3012132179001 в ОАО «Банк БелВЭБ» ГРО № 530 г. Минск, МФО 153001226, УНП 490317170.

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 5% от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Затраты на организацию и проведение торгов в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление установленной формы (подробности по тел.) с приложением: копии платежного поручения о внесении суммы задатка, для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лиц – копия паспорта либо иного документа удостоверяющего личность.

Срок подачи заявления: с момента выхода настоящего объявления **до 16.00 04.07.2012 года** по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5.

Дата, время, место проведения открытого аукциона: **05.07.2012 года в 12.00,** г. Гомель, ул. Молодости, 5.

**По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: (8 029) 621 22 36 или тел./факс 8 0232 65 25 50.**
**Дополнительная информация: www.disponent.by**



## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества | **Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-41685 общей площадью 186,8 м.кв., назначение – здание административно-хозяйственное стоимостью 504 219 200 руб.** |
| Собственник (владелец) имущества | **ДКУП «Витебский сельский строительный комбинат»** |
| Местонахождение (адрес) имущества | **г. Витебск, пр. Московский, 120** |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | **г. Витебск, ул. П. Бровки, 8 06.07.2012 г. в 15.30** |
| Информация об обременениях имущества | **Обременений нет** |
| Справочная информация об организаторе торгов | Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д.32, каб. 321, http://vitebsk.court.by/, http://vitebsk@court.by/ судебный исполнитель Зуев Михаил Евгеньевич, тел./факс (80212) 49 13 43, (8 044) 734 93 00, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел.: (80212) 49 13 40, (8044) 746 73 00. |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 % от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, **не позднее 15 ч. 30 м. 06.07.2012 г.**<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. |


У суд Докшыцкага раёна Віцебскай вобл. паступіла заява аб аб'яўленні памерлым Бодрага Уладзіміра Віктаравіча, 17 кастрычніка 1967 года нараджэння, ураджэнца ст. Крулеўшчызна Докшыцкага раёна Віцебскай вобл., месца знаходжанне якога невядомае. Апошняе вядомае месца жыхарства: в. Крулеўшчына, вул. Палявога, д. 4/1, кв. 3 Докшыцкага раёна Віцебскай вобл.

Просім грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра Бодрага Уладзіміра Віктаравіча, паведаміць іх суду Докшыцкага раёна на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.


**Считать недействительными** страховые полисы ФСООО «Белкоопстрах»: по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ 0430178, 0336725, 0391571, 0224051-0224080, 0316955-0316958; по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств, выезжающих за пределы РБ «Зеленая карта» серии BY/12/5785507, 5785508; договор страхования универсальный формы 2РН, 2РП серии БК 0071329; квитанции 1СУ серии КС 0594930-0594936. УНП 102332274



БЕЛАРУСБАНК 90 лет

## ОАО «АСБ Беларусбанк» сообщает о снижении с 01.06.2012 по 30.09.2012 стоимости обслуживания международных карточек MasterCard Gold, VISA Gold, MasterCard Standard, VISA Classic (со счетом в одной валюте):

| | Счет в USD | Счет в EUR | Счет в BYR |
|---|---|---|---|
| **Обслуживание карточки MasterCard Gold с магнитной полосой со сроком действия 1 год** | | | |
| **основной:** | | | |
| - за первый год обслуживания | 45 долларов США | 30 евро | 250 000 бел. руб. |
| - за второй год обслуживания | 35 долларов США | 20 евро | 220 000 бел. руб. |
| - за третий и каждый последующий год обслуживания | 30 долларов США | 15 евро | 180 000 бел. руб. |
| **дополнительной** | 30 долларов США | 15 евро | 180 000 бел. руб. |
| **Обслуживание микропроцессорной карточки MasterCard Gold, VISA Gold со сроком действия 1 год** | | | |
| **основной:** | | | |
| - за первый год обслуживания | 50 долларов США | 35 евро | 300 000 бел. руб. |
| - за второй год обслуживания | 45 долларов США | 30 евро | 250 000 бел. руб. |
| - за третий и каждый последующий год обслуживания | 35 долларов США | 25 евро | 200 000 бел. руб. |
| **дополнительной** | 35 долларов США | 25 евро | 200 000 бел. руб. |
| **Обслуживание микропроцессорной карточки MasterCard Gold, VISA Gold со сроком действия 2 года** | | | |
| **основной:** | | | |
| - за первые два года обслуживания | 75 долларов США | 50 евро | 450 000 бел. руб. |
| - за каждые последующие два года обслуживания | 50 долларов США | 35 евро | 300 000 бел. руб. |
| **дополнительной** | 35 долларов США | 25 евро | 200 000 бел. руб. |
| **Обслуживание микропроцессорной карточки MasterCard Standard, VISA Classic со сроком действия 1 год** | | | |
| **основной:** | | | |
| - за первый год обслуживания | 15 долларов США | 10 евро | 75 000 бел. руб. |
| - за второй год обслуживания | 10 долларов США | 7 евро | 60 000 бел. руб. |
| - за третий и каждый последующий год обслуживания | 5 долларов США | 5 евро | 45 000 бел. руб. |
| **дополнительной** | 5 долларов США | 5 евро | 45 000 бел. руб. |
| **Обслуживание микропроцессорной карточки MasterCard Standard, VISA Classic со сроком действия 2 года** | | | |
| **основной:** | | | |
| - за первые два года обслуживания | 20 долларов США | 15 евро | 100 000 бел. руб. |
| - за каждые последующие два года обслуживания | 15 долларов США | 10 евро | 90 000 бел. руб. |
| **дополнительной** | 10 долларов США | 5 евро | 45 000 бел. руб. |

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г. выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*



## КПУП «Мозырский СДСК-1» проводит аукцион по продаже недвижимого имущества в процессе ликвидации. Имущество находится по адресу: Гомельская область, г. Мозырь.

| № лота | Наименование объекта | Тип объекта | Общая площадь, м² | Оценочная стоимость (руб.) | Стартовая цена (руб.) | Сумма залога (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Главный производственный корпус | Здание одноэтажное, панельное | 11988 | 3 098 583 000 | 1 200 000 000 | 80 000 000 |
| 2 | Бетоносмесительный цех | Здание восьмиэтажное, панельное | 1206 | 444 024 000 | 146 000 000 | 12 000 000 |
| 3 | Склад цемента | Здание одноэтажное, кирпичное, 4 ж/б емкости | 215 | 486 855 000 | 149 000 000 | 14 000 000 |
| 4 | Двухэтажное здание (бытовка) | Здание двухэтажное, панельное | 471 | 140 787 000 | 41 600 000 | 4 600 000 |
| 5 | Склад инертных материалов | Бетон, кирпич, шифер | 1545 | 420 799 000 | 120 000 000 | 10 000 000 |

Продавец: КПУП «Мозырский СДСК-1».

Организатор аукциона: управляющий.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за объект.

Срок подписания договора купли продажи объекта торгов, в течение 10 дней после дня проведения торгов.

В случае признания торгов не состоявшимися в связи с подачей заявления одним участником, предмет торгов может быть продан участнику по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Форма, порядок оплаты: безналичный платеж на р/с № 3012265610018 ЗАО «Банк ВТБ (Беларусь)» г. Минск, Региональная дирекция № 100 г. Мозырь, БИК 153001108, получатель КПУП «Мозырский СДСК-1», УНП 400088810.

Сумма залога вносится на р/с № 3012265610018 ЗАО «Банк ВТБ (Беларусь)» г. Минск, Региональная дирекция № 100 г. Мозырь, БИК 153001108, получатель КПУП «Мозырский СДСК-1», УНП 400088810.

Документы, предоставляемые для участия в аукционе: заявление на участие, копии платежных документов, подтверждающих внесение залога, копию устава, доверенность представителю юридического лица, копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя, паспорт физическому лицу.

Заявки принимаются **до 12.00 11 июня 2012 года** по адресу: 247760, г. Мозырь, КПУП «Мозырский СДСК-1».

Аукцион состоится **12 июня 2012 года в 14.00** по адресу: г. Мозырь, КПУП «Мозырский СДСК-1».

**Справки по телефону: 8 0236 33 64 38, 8 029 663 84 96.**



## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-3209 | **Здание административно-хозяйственное(контора), год постройки 1970,** количество этажей – 1, общая площадь здания 146,2 м.кв. Принадлежность: пристройка 1995 года постройки, площадь – 30 кв.м; веранда 1995 года постройки, площадь – 5 кв.м. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-2486 | **Здание комплексной механизации,** количество этажей – 1, год постройки 1970, общая площадь здания 466,7 м.кв. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-2488 | **Здание нежилое (мастерская кирпичная),** год постройки 1964, количество этажей – 1, общая площадь здания 476,1 м.кв. Принадлежность: пристройка 1970 года постройки, площадь – 20 кв.м; пристройка 1970 года постройки, площадь – 44 кв.м; пристройка 1970 года постройки, площадь – 12 кв.м. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-2489 | **Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции),** год постройки 1970, количество этажей – 1, общая площадь здания 374,5 м.кв. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-3203 | **Здание нежилое (котельная кирпичная), год постройки 1970,** количество этажей – 1, общая площадь здания 117,6 м.кв. Принадлежность: дымовая труба, 1979 года постройки, объем – 800 мм, стены и перегородки – металлические. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-2491 | **Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (материально-технический склад), год постройки 1970,** количество этажей – 1, общая площадь здания 230,6 м.кв. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-2490 | **Здание специализированное культурно-просветительного и зрелищного назначения (клуб кирпичный), год постройки 1970,** количество этажей – 1, общая площадь здания 250,2 м.кв. Принадлежность: веранда 1970 года постройки, площадь – 3 кв.м; веранда 1970 года постройки, площадь – 3 кв.м, пристройка 1970 года постройки, площадь 108 кв.м. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-3207 | **Здание нежилое (туалет наружный) , год постройки 1978,** количество этажей – 1, общая площадь здания 6,2 м.кв. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-2492 | **Здание нежилое (диспетчерская), год постройки 1970,** количество этажей – 1, общая площадь здания 62,4 м.кв. Принадлежность: веранда, 1970 года постройки, площадь – 10 кв.м. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-3204 | **Здание специализированное автомобильного транспорта (здание профилактория), год постройки 1978,** количество этажей – 2, площадь застройки 895 кв.м. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-3205 | **Здание нежилое (трансформаторная подстанция), год постройки 1978,** количество этажей – 2, общая площадь здания 27,6 м.кв. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-5093 | **Здание нежилое (насосная), год постройки 1970,** количество этажей – 1, общая площадь здания 9,2 м.кв. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-3206 | **Здание нежилое (туалет), год постройки 1992,** количество этажей – 1, общая площадь здания 1,3 м.кв. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-1631 | **Сооружение специализированное транспорта (автозаправочная станция), год постройки 1985,** количество этажей – 1, общая площадь здания 39,1 м.кв. Принадлежность: пристройка, 1985 года постройки, площадь – 7 м.кв. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-3208 | **Здание нежилое (здание контрольно- пропускного пункта),** количество этажей – 2, общая площадь здания 58,4 м.кв. Принадлежность: пристройка, 1970 года постройки, площадь 12 кв.м, навес, 1970 года постройки, площадь 51 кв.м. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-9198 | **Сооружение специализированное транспорта (эстакада для мойки машин), год постройки 1970,** материал – железобетон; длина – 12,84 м, расположение сооружения – надземное на ж/б блоках. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-9202 | **Сооружение специализированное водохозяйственного назначения (сеть водопроводная), год постройки 1970,** перечень объектов входящих в состав сооружения: водопроводная сеть; башня водонапорная; колодец смотровой, пожарный резервуар; ввод; водовод. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-9201 | **Сооружение специализированное коммунального хозяйства (тепловая сеть), год постройки 1970,** перечень объектов, входящих в состав сооружения: тепловая сеть; колодец смотровой; тепловая сеть; тепловая сеть; трубопровод горячего водоснабжения. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-9200 | **Сооружение специализированное энергетики, год постройки 1970,** перечень объектов, входящих в состав сооружения: воздушная линия электропередачи, столбы электрические из пропитанной древесины, столбы электрические ж/б, кабельная линия электропередач (воздушной прокладки), кабельная линия электропередач (подземной прокладки) – 2 шт. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-5095 | **Сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства (забор железобетонный), год постройки 1985,** перечень объектов, входящих в состав сооружения: забор ж/б, ворота автомобильные – 2 шт., ворота автомобильные механические, калитка. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-9199 | **Сооружение специализированное транспорта (эстакада), год постройки 1992,** перечень объектов, входящих в состав сооружения: эстакада, материал – железобетон, длина 19,5 м, расположение сооружения – надземное на ж/б блоках. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-9203 | **Сооружение специализированное коммунального хозяйства (сеть канализационная),** перечень объектов, входящих в состав сооружения: сеть канализационная, 1970 года постройки, материал – керамика, диаметр – 200 мм, протяженность – 338,6 м/п; хозяйственно-бытовая канализация, 1988 года постройки, материал – керамика, диаметр – 250 мм, протяженность – 12,5; колодец смотровой. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-9408 | **Сооружение специализированное водохозяйственного назначения (артезианская скважина),** 1969 года постройки, материал – сталь, диаметр – 50 мм, глубина – 46,0 м. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 441/С-5094 | **Сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства (асфальтно-бетонное дворовое покрытие), год постройки 1970,** перечень объектов, входящих в состав сооружения: асфальтное покрытие; бетонное покрытие. |
| | **Щит ЩО-70, инвентарный № 001050; трансформатор ТМ 250 КВА (силовой), инвентарный № 001052.** |
| Местонахождение объекта | Гродненская область, Ивьевский район, г.п. Юратишки |
| Земельный участок | Кадастровый № 422955700001000101, площадь 3,8279 га, назначение – для обслуживания зданий и сооружений |
| Начальная цена продажи | 1 205 863 410 белорусских рублей с учетом НДС |
| Сумма задатка | 120 586 341 белорусский рубль |
| Продавец | Филиал «Автобусный парк № 2 г. Лида» ОАО «Гроднооблавтотранс», 231300, г. Лида, ул. Транспортная, 10 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41 98 32 |
| Условия аукциона | Ремонт нежилых помещений и ввод в эксплуатацию в течение двух лет с момента заключения договора купли-продажи |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 12 июня 2012 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; копии учредительных документов;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

Извещение о первом аукционе было размещено в газете «Звязда» **№ 220 (27084) от 18.11.2011 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30.**

**Последний день приема заявлений 11 июня 2012 г. до 15.00.**

**Телефон для справок: 41 98 32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**
**Дополнительная информация: www.ino.by**

2012 ГОД КНІГІ

# «ЖЫВАЯ» БІБЛІЯТЭКА

## «Педагога хлебам не кармі — дай кнігу!»

**Менавіта такімі словамі сустрэлі прадстаўнікоў Прэзідэнцкай бібліятэкі Беларусі ў Сеніцкай сярэдняй школе імя Я. Купалы. Напрыканцы навучальнага года ў школьную бібліятэку перадалі каля 420 розных кніг — энцыклапедычныя слоўнікі, вучэбныя дапаможнікі для педагогаў, часопісы, мастацкая літаратура, сшыткі для вучняў усіх класаў.**



Дырэктар Сеніцкай сярэдняй школы імя Я. Купалы Тамара МАРЭЦКАЯ, намеснік дырэктара па навуковай рабоце Прэзідэнцкай бібліятэкі Людміла НАВУМАВА, бібліятэкар Марына КУШНІР і сямікласніцы Дар'я ЗЯНКЕВІЧ і Ангеліна ШАЎЧУК разглядаюць новае паступленне кніг.



Сямікласнікі Андрэй ПРАЦЭНКА і Максім БЯГАНСКІ дапамагаюць пераносіць кнігі ў школьную бібліятэку.

— Мы дапамагаем сфарміраваць «жывую» бібліятэку, якую не забываем пастаянна папаўняць, — дзеліцца Таццяна Лычагіна, загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Прэзідэнцкай бібліятэкі. — Толькі сёлета ў Сеніцкую сярэднюю школу мы перадалі каля тысячы кніг, а колькі за тры гады — нават і палічыць складана.

На развітанне абавязковае пытанне: якую літаратуру трэба яшчэ прывезці? Бо, як расказалі супрацоўнікі Прэзідэнцкай бібліятэкі, далейшае супрацоўніцтва — у планах яшчэ як мінімум гадоў на сем.

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**

*в. Сеніца.*

# Маленькія разумнікі з Еўдакімавіч

**У аграгарадку Еўдакімавічы Шклоўскага раёна, цэнтры Заходаўскага сельсавета, дзіцячы садок і школа месцяцца ў адным прыгожым і ўтульным будынку, абсаджаным кветкамі і дрэвамі. Школьнікі завяршаюць навучальны год, затое на пляцоўцы дзіцячага садка шумна і весела. Малыя атрымліваюць асалоду ад бесклапотнага сонечнага дня...**



Глеб Кавалёў з любімай цацкай.

Сёння ў гэтай установе — 24 дзіцяці, некаторых з іх прывозяць з аддаленых вёсак за дзясятак кіламетраў. Мясцовая сельская гаспадарка дапамагае рамонтам і ўсім неабходным.

Выхавальніца Наталля Чайкова расказвае пра адметнасці сельскага дзіцячага садка. Гэта найперш — рознаўзроставая група, дзе аб'яднаны дзеці ад 2 да 6 гадоў. Можа, не вельмі зручна, затое малыя цягнуцца да старэйшых, актыўна кантактуюць з імі і таму развіваюцца хутчэй, чым іх гарадскія равеснікі.

— У нас дзеці смешныя, класныя, «прасунутыя» і разумныя! — так характарызуе сваіх выхаванцаў Наталля Чайкова.

Насці Ісачанка толькі 3 гады, але яна ўжо надзявае фартух і старанна палівае пакаёвыя расліны ў групе.

— Мая мама на рабоце працуе, нешта піша, — аўтарытэтна паведамляе малая. Выхавальніца падказвае, што маці дзяўчынкі працуе бухгалтарам.

Адразу відаць, што ў Ксюшы Лялікавай мама — кухар. Дзяўчынка, якой споўнілася 6 гадоў, стараецца накарміць сваю малодшую сястру Машу і 5-гадовага сябра Даніка Ганчарова. На абед таксама запрошана і мясцовая лялька Барбі.



Ксюша, Маша і Данік.

— Мы ядзім макарону! — паведаміла Ксюша.

Надзі Чыжык споўнілася 6 гадоў, збіраецца ў хуткім часе ў школу, але з выбарам прафесіі ўжо цвёрда вызначылася.

— Мае мама і татка — працуюць на ферме, а я буду пажарным. Як для чаго? Каб тушыць агонь!

Глеб Кавалёў, якому толькі 4 гады, сарамліва ўсміхаецца і прыціскае да сябе любімую цацку — мяккага шэрага труса. Бацька хлопчыка — механізатар, а маці клапоціцца пра малых у садку.

Сярожа Разумнікаў носіць шапку з выявай амерыканскага супергероя Чалавека-павука, але геройстваваць хоча толькі на беларускіх палях. Ён расказвае, што будзе трактарыстам — як і яго тата.

**Ілона ІВАНОВА, фота аўтара.**

*Шклоўскі раён.*

### НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў ЧЭРВЕНІ

| | | |
|---|---|---|
| **1, пятніца,** 0.30 — 11.30 | **12, аўторак,** 0.00 — 3.30 | **22, пятніца,** 0.00 — 2.30 |
| **3, нядзеля,** 8.30 — 11.30 | **14, чацвер,** 2.00 — 15.30 | **23, субота,** 21.30 — 24.00 |
| **5, аўторак,** 4.00 — 11.30 | **16, субота,** 11.00 — 24.00 | **24, нядзеля,** 0.00 — 10.30 |
| **7, чацвер,** 11.30 — 13.30 | **17, нядзеля,** 0.00 — 4.30 | **26, аўторак,** 10.00 — 16.00 |
| **9, субота,** 17.30 — 18.30 | **19, аўторак,** 14.00 — 16.30 | **28, чацвер,** 7.30 — 19.30 |
| **11, панядзелак,** 9.30 — 23.00 | **21, чацвер,** 15.30 — 24.00 | **30, субота,** 18.30 — 21.00 |

### У НАСТУПНЫМ НУМАРЫ



**У 1939-ым, напярэдадні вайны, Беларусь мела 2,5 мільёна авечак. Але большасць (1,7 мільёна) была ў насельніцтва. А ў грамадскім сектары — 800 тысяч. У 1985 было 382 тысячы авечак у саўгасах, калгасах і 247 тысяч у хатніх падворках. Гэта быў пік авечкагадоўлі — 120 спецыяльных гаспадарак на ўсю краіну. А цяпер у нас іх усяго крыху больш дзесяці, сярод якіх толькі адна дзяржаўная.**

Даты | Падзеі | Людзі

**1840** год — створаны тэатр Дуніна-Марцінкевіча. Гэта быў першы беларускі тэатр, які аб'яднаў усе віды сцэнічнага мастацтва — драматычны, музычны, вакальны і танцавальны. У трупу тэатра ўваходзілі сам пісьменнік Вікенцій Іванавіч, члены яго сям'і, суседзі, знаёмыя, удзельнічалі таксама вучні яго школы і сяляне. Выступленні прымяркоўваліся да свят і ўрачыстых дзён. Спецыяльна для гэтага драматург пісаў новыя камедыі. У тэатры былі пастаўлены спектаклі «Рэкруцкі набор» і «Ідылія». Дзень пастаноўкі оперы «Ідылія» ўпісаны залатымі літарамі ў гісторыю беларускага тэатра, усёй беларускай нацыянальнай культуры. Тэатр Дуніна-Марцінкевіча садзейнічаў развіццю прафесійнага тэатральнага мастацтва ў Беларусі.



**1926** год — нарадзілася Мэрылін Манро (Норма Джын Бейкер Мартэнсан), славутая амерыканская актрыса, спявачка, мадэль і проста — самая вядомая бландзінка ў свеце. Яна пражыла ўсяго 36 гадоў і засталася бессмяротнай. Прыгажосць і жаноцкасць Мэрылін Манро сталі міфам. Сакрэт яе аглушальнага поспеху здзіўляе. Сумная гісторыя жыцця нагадвае казку пра Папялушку. Таямніца яе смерці не разгадана і сёння...

**1937** год — нарадзіўся (вёска Стары Дзедзін Клімавіцкага раёна) Мікалай Андрэевіч Кавалёў, беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі, акадэмік НАН Беларусі (2003), акадэмік Акадэміі аграрных навук Беларусі (1994—2002), доктар ветэрынарных навук, прафесар. Аўтар больш як 360 навуковых прац, прысвечаных эпізааталогіі патагенезу, распрацоўцы і ўдасканаленні сродкаў і спосабаў дыягностыкі, лячэння і прафілактыкі інфекцыйных захворванняў жывёл.

**Было сказана**

**Пімен Панчанка (1917—1995), народны паэт Беларусі:**

***«Той дзень прапаў і страчаны навекі, калі ты не зрабіў таго, што мог».***

## ПЕЧКА НА КОЛАХ

**У Асіповічах вызначылі пераможцу конкурсу на лепшую скульптуру, якая можа стаць сімвалам гэтага горада. Яе аўтар — скульптар Аляксандр Дранец.**

Скульптурная кампазіцыя звязана з легендай узнікнення Асіповіч. Лічыцца, што вёска пад гэтай назвай узнікла некалькі стагоддзяў таму. Яе заснавальнікам стаў волат Восіп, сын сумленнага лесніка, які верай і праўдай служыў князю і атрымаў ад яго зямлю і лес. Гэтае месца і сталі зваць Восіпавічамі. Таму невыпадкова, што галоўны герой скульптуры — легендарны асілак.

Асіповічы ўзніклі на скрыжаванні дарог, і цяпер гэта перш за ўсё — буйны чыгуначны цэнтр. Таму печка Восіпа стаіць на колах і больш нагадвае паравоз. Радасны Восіп трымае кошык з дарамі шчодрых асіповіцкіх лясоў і вязанку рыбы, а гасціннасць тутэйшых людзей сімвалізуе гаспадарскі самавар.

Стварэнне і ўсталяванне скульптуры, якая стала б прыгожым сімвалам Асіповіч, адбываецца ў межах падрыхтоўкі да 140-годдзя раённага цэнтра.

**Ілона ІВАНОВА.**



**Лявон ЦЕЛЕШ,** *г. Дзяржынск.*



## Старажытная Беларусь — калыска кнігадрукавання Усходняй Еўропы

**Па гарызанталі: 1.** У мінулым назва майстэрні па вырабе паперы; на Беларусі ... здаўна існавалі ў Смаргоні, Нясвіжы, Заслаў'і, Ружанах і іншых паселішчах. **4.** Старажытная назва г. Брэста, дзе ў 1553 годзе была заснавана першая на Беларусі друкарня. **7.** Мяккае пластычнае рэчыва: выкарыстоўвалася ў старажытныя часы ў якасці пакрыцця дошчачкі, надпісы на якую наносіліся пісалам. **8.** Паэт і музыкант, выканаўца ўласных песень; у старажытнасці — баян. **10.** Рукапіс на пісчым матэрыяле з цялячай скуры. **13.** Яраслаў ... .Кіеўскі князь, сын полацкай княгіні Рагнеды, аўтар першага на Русі збора законаў «Праўда Яраслава». **14.** «Так гнуцца, гойдаюцца травы,\\Як пройме вецер іх ласкавы,\\І пойдуць ... травяныя». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля». **15.** У старажытнагрэчаскай міфалогіі — німфы рэк і крыніц. **16.** «Вялесава ...». Першы помнік славянскай культуры 9 стагоддзя; быў напісаны на двухбаковых букавых дошчачках. **17.** Тое, што і сіло. **18.** «Вясенняя зораў сяўба\\Расой ападае на ...». З верша М. Танка «У полі вярба». **20.** «... пра паход Ігараў». Помнік сярэднявечнай літаратуры канца 12 стагоддзя, дзе ўпершыню згадваецца г. Мінск («На Нямізе галовы сцелюць снапамі»). **21.** Раздзел кнігі. **25.** Кніга, першае выданне на беларускай мове асветніка С. Буднага, якое было надрукавана ў Нясвіжскай друкарні ў 1562 годзе. **27.** «Парой ён спыніцца, каб лепей завастрыць\\... гусінае». З верша М. Багдановіча «Перапісчык». **28.** Тытульны ... . Першы заглаўны аркуш кнігі, які ўпершыню быў выкарыстаны ў выданнях беларускага асветніка, пісьменніка, кнігадрукара Ф. Скарыны. **29.** Невялікая наразная пячаць на пярсцёнку з імем сына княгіні Рагнеды Ізяслава; самы старажытны помнік пісьменства на Беларусі. **30.** Кніга, якую выдалі ў 1564 годзе ўраджэнцы Беларусі: друкар, гравёр Пётр Мсціславец і заснавальнік кнігадрукавання ў Расіі і ва Украіне Іван Фёдараў.

**Па вертыкалі: 2.** Драматычны твор; жыхары сярэднявечнай Расіі ўпершыню азнаёміліся з гэтым драматычным жанрам дзякуючы беларускаму асветніку, пісьменніку Сімяону Полацкаму. Менавіта з яго драматургіі ў Расіі пачынаўся прафесійны тэатр. **3.** Тое, што і мелодыя. **5.** Высокая елка. **6.** Народнае эпічнае апавяданне. **7.** Высокагатункавая тоўстая папера. **9.** Заходняя ... . Рака на Беларусі, у рэчышчы якой былі знойдзены «Барысавы камяні», помнік эпіграфікі 12 стагоддзя. **11.** Свецкае імя Ефрасінні Полацкай, якая ў келлі Сафійскага сабора займалася перапіскай кніг, ёю была створана і першая на Беларусі школа. **12.** Лаўрышаўскае ... . Беларускі рукапісны помнік 14 стагоддзя; знаходзіцца на захоўванні ў г. Кракаве (Польшча). **17.** Паходка, манера ступаць. **19.** Беларускамоўны звод законаў, які быў выдадзены ў старажытнай беларускай дзяржаве ВКЛ у 1529, 1566 і 1588 гадах. **22.** Частка тэксту або асобныя словы, надрукаваныя ў адну лінію. **23.** ... Орлік. Імя ўкраінскага дзяржаўнага дзеяча 18 стагоддзя, ураджэнца Ашмянскага павета (цяпер Вілейскі раён), аўтара першай украінскай канстытуцыі; яго імем названы аэрапорт Арлі ў г. Парыжы . **24.** Лугавая птушка; тое, што і дзяркач. **26.** Тое, што і паэт (стараж.).

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 1. Паперня. 4. Бярэсце. 7. Воск. 8. Бард. 10. Пергамент. 13. Мудры. 14. Хвалі. 15. Наяды. 16. Кніга. 17. Пятля. 18. Верас. 20. Слова. 21. Глава. 25. «Катэхізіс». 27. Пяро. 28. Ліст. 29. Пячатка. 30. «Апостал».

**Па вертыкалі:** 2. П'еса. 2. Напеў. 5. Яліна. 6. Сказ. 7. Ватман. 9. Дзвіна. 11. Прадслава. 12. Евангелле. 17. Поступ. 19. Статут. 22. Радок. 23. Піліп. 24. Драч. 26. Піїт.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 4.44 | 21.31 | 16.47 |
| Віцебск | — 4.26 | 21.29 | 17.03 |
| Магілёў | — 4.34 | 21.22 | 16.48 |
| Гомель | — 4.40 | 21.09 | 16.29 |
| Гродна | — 5.01 | 21.45 | 16.44 |
| Брэст | — 5.11 | 21.37 | 16.26 |

**Месяц**

*Поўня 4 чэрвеня.*
*Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

**Імяніны**

*Пр. Дзмітрыя, Івана, Ігната, Карнілы, Мітрафана, Сяргея.*
*К. Магдалены, Кандрата, Якуба.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +10..+12°C | КІЕЎ +19..+21°C | РЫГА +11..+13°C |
| ВІЛЬНЮС +9..+11°C | МАСКВА +16..+17°C | С.-ПЕЦЯРБУРГ +10..+12°C |

### УСМІХНЕМСЯ

**Мужык сказаў — адрамантуе кран, значыць — адрамантуе! І не трэба яму кожныя паўгода пра гэта нагадваць!**

— Якое самае сумнае месца на Зямлі?

— Працоўнае!

**Грэчаская салата, якая прастаяла тыдзень у халадзільніку, не псуецца, а становіцца антычнай.**

— Ты на рыбалцы колькі злавіў?
— Менш, чым Мікола.
— Дык ён жа нічога не злавіў!
— А я яшчэ і вуду згубіў...

**Чалавек, які ўчора страціў партаманет, ведай: сем тостаў былі за тваё здароўе!**



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 30.015. Індэкс 63850. Зак. № 2346.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 31 мая 2012 года.